PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 22 (2455) Год XLVIII | Беласток, 1 чэрвеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У Беластоку „адкрыюць вочы”

Ганна Кандрацюк

Калі Яніна Кандрацюк паляцела ў Нямеччыну працаваць як валанцёрка ў міжнароднай адукацыйнай праграме „Сакратэс”, сябры пажартавалі: *Паехала далучыць сваіх вучняў да Еўропы!*

— У параўнанні з усімі рэгіёнамі Польшчы мы ў самым канцы. Настаўнікі, ад якіх усё залежыць, наогул не вераць у змены на лепшае, — кажа Яніна. — Другая прычына: страх перад англійскай мовай.

У Беластоку Кураторыя вылучыла дзве школы, у тым ліку Пачатковую школу н-р 4, дзе вядзецца навучанне беларускай мове.

* * *

— Чаму якраз наша „чацвёрка”? Наша школа невялікая, усяго 460 вучняў. Мы ў цэнтры горада і прадстаўляем тыповы спектр грамадства. Нашы навучэнцы з разнавідных асяроддзяў: большасць дзяцей з сярэднезаможных сем’яў, ёсць таксама з багатых, бедных і нават паталагічных. Нашым прыярытэтам — нацыянальная разнавіднасць, дарэчы, характэрная для рэгіёна. Даволі вялікая група дзяцей вывучае беларускую мову. Настаўнікі вядуць пазаўрочныя гурткі зацікаўленняў: мастацкія і прадметныя, часта паводле ўласных праектаў, — пералічвае Яніна.

Пра яе ўдзельніцтва ў праграме вырашыла веданне англійскай мовы. Дырэктар Збігнеў Клімовіч паклікаў Яніну Кандрацюк у кабінет і расказаў пра праграму. Далей была сустрэча ў Кураторыі з Ежы Мантурам, каардынатарам „Сакратэса”.

— У мяне былі сумненні, — прызнаецца Яніна. — Мне не хапала досведу напісаць адукацыйны праект. З другога боку, я хацела праверыць свае медыяцыйныя і валанцёрскія здольнасці. Люблю працаваць дзеля іншых, дзяліцца сваім вопытам і ведамі.

Яніна Кандрацюк родам з Катлоўкі што каля Нарвы. Яна — выпускніца Гайнаўскага беларускага ліцэя (выхавацель — Яўген Вапа) і Мінскага лінгвістычнага універсітэта. У Канадзе закончыла Міжнародны моўны інстытут. Зараз валодае англійскай, французскай, рускай, польскай, беларускай мовамі ды родным падляшскім дыялектам.

Ужо першага дня ёй пашанцавала знайсці сваёй школе пяць партнёраў: школы ў Англіі, Нямеччыне, Даніі, Чэхіі і Венгрыі. Настаўнікі супольна напісалі адукацыйны праект і назвалі яго „Адкрый вочы”.

* * *

— Чаму ваш праект завецца, менавіта: „Адкрый вочы”?

— Справа ў адкрыцці на свет, кара-

[працяг ☞ 3]

Фота ПЯТРА НЕМЧЫНОВІЧА

На адкрыцці XXII Фестывалю царкоўнай музыкі з Сімфанічным аркестрам Беластоцкай філармоніі выступілі хоры з Гданьска і Масквы

Майстэрства і духоўнасць

Аляксандр Максімюк

Мікалай Бушко не паддаўся і арганізаваў XXII Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі — Гайнаўка 2003. З Гайнаўкі ў гэтым годзе засталася толькі назва, бо Фестываль поўнасцю прайшоў у Беластоку — у Беластоцкай філармоніі і Палацы Браніцкіх. Толькі назва і... аж назва, бо дырэктар Фестывалю М. Бушко і яго супрацоўнікі працавалі на яе доўгімі гадамі.

Было некалькі сур’ёзных фактараў, якія схілілі арганізатараў Фестывалю не паддавацца — самы важны з іх той, што ад Фестывалю не адвярнулася музычнае асяроддзе Польшчы, наадварот, у гэтым годзе яно аказала моцную падтрымку Фестывалю ў той формуле, якую менавіта праводзіць М. Бушко. У XXII выпуску прыняў удзел сусветнай вядомасці польскі кампазітар Кшыштаф Пендэрэцкі, пад кіраўніцтвам якога Камерны хор Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. Чайкоўскага выканаў адну кампазіцыю („Иже Херувимы”) на адкрыцці Фестывалю 20 мая г.г.

Выхад Фестывалю са святыні выйшаў яму на карысць. Публіка ўсе конкурсныя слуханні сядзіць у крэслах, няма абмежаванняў ва ўзнагароджванні выканаўцаў воплескамі, а ў час гала-канцэрта — можна колькі заўгодна дамагацца бісаў. Гэта жарт, усё ж не ў гэтым праявілася перавага сёлетняга Фестывалю над папярэднімі яго выпускамі. Пераход у Беласток радыкальна адмяніў профіль публікі. Беласток на фоне ўсяго нашага беднага і адсталага ў Польшчы рэгіёна з’яўляецца ўсё ж месцам моцна мітуслівым і запрацаваным. Мабыць, людзі больш тут цэняць якасны адпачынак — прыходзяць у філармонію перш за ўсё дзеля музыкі, а не падлічваць колькі сюды з’явілася бацюшкаў ды якіх яны канфесій. Другая справа гэта сама філармонія — месца ў сваёй сутнасці прызначанае для музыкі і якое напэўна не спараджае ўнутраных тармазоў прыйсці і паслухаць царкоўнай музыкі таксама „шэраговым католікам”.

Фота ПЯТРА НЕМЧЫНОВІЧА

Кшыштаф Пендэрэцкі

Адсутнасць на „Бушкавым фестывалі” прадстаўнікоў управы Падляшскага ваяводства даказала толькі, што ўвесь гэты падзел на два фестывалі мае выключна ўнутрыпольскі і ўнутрыпартыйны характар. З музыкай нічога тут супольнага. А гэтая апошняя, дарэчы, і стала галоўным героем гайнаўскага фестывалю ў Беластоку. Уражальны быў канцэрт на адкрыццё Фестывалю — быў гэта канцэрт сучаснай класічнай музыкі падшытай спадчынай царкоўнага спеву. У галоўных ролях выступілі тут Хор маскоўскай кансерваторыі (ды-

[працяг ☞ 3]

Еўропа не павінна быць... ☞ 4

Палітычныя і гаспадарчыя працэсы ў Еўропе ў апошніх дзесяцігоддзях спрыяюць узнікненню сістэмы агульнай бяспекі. Бяспека гэтая будуецца аднак не на раўнавазе страху, але на перакананні, што ўсяго магчыма дасягнуць у Еўропе дарогай кампрамісаў. Такая логіка патрабуе на практыцы часу, цярплівасці і вялікай палітычнай культуры.

Еўрасаюзны конь ☞ 4

Так супала, што і рэферэндумная кампанія набрала тэмпу. Не толькі пачала непасрэдна даходзіць да жыхароў Беластока і Падляшскага ваяводства ў час рознай масці пленэрных фэстаў, але і шляхам платных рэкламных перадач у радыё і тэлебачанні. На жаль, 70 партый, таварыстваў і фондаў выкарыстоўвае даны ім час дзеля рэкламавання ўласных арганізацый і паказвання паасобных сваіх членаў.

Навасады ў Дзень перамогі ☞ 8

Солтыс кажа, бядовая справа цяпер на вёсцы. Як усюды. Калісь то пайшоў бы ў які камітэт, калі што не так. Цяпер толькі аблясіць вёску, рэшта вымра, *і спокуй*. Хоць старыя пра тую Вунію адзін з адным перапытваюць, то што ім — абы *рэнты* не сарвалі.

Цуд у Бобры ☞ 9

Тры разы слаў мітрапаліту Філарэту прашэнне, каб благаславіў маю задуму, каб малітва „Ойча наш” у кнізе Стварыцеля была на беларускай мове. Гады ідуць, а адказу як не было, так няма. Людзі здзіўляюцца, пытаюць: „Саша, а чаму ў Пісанні белыя старонкі? Што гэта абазначае?”

Любіў Беларусь ☞ 10

Уладзімір Тамашчык нарадзіўся 15 красавіка 1900 года на Гродзеншчыне. Бацькі яго — Даніла Тамашчык і Марыя Жанеўская, былі заможнымі і руплівымі гаспадарамі. Яны ў 1903 годзе купілі маёнтак Дубляны недалёка ад Вялікай Бераставіцы, куды і пераехалі на сталае жыццё. Але радасці было мала, бо пачалася першая сусветная вайна, якая заставіла сям’ю Тамашчыкаў эвакуіравацца ў Расію.

Цікаючая кантрабанда ☞ 11

Памежнікі затрымалі беларуса, які хацеў увезці... 1 265 наручных гадзіннікаў. Да кантрабанды мела дайсці на пагранпераходзе ў Баброўніках. Гадзіннікі былі знойдзены ў люку пад падлогай аўтобуса.

Беларусь — беларусы

Візавы рэжым не за гарамі

Да ўвядзення візавага рэжыму засталося ўсяго месяц часу, але адпаведныя міжурадавыя пагадненні Польшчы з краінамі-суседкамі — Беларуссю, Украінай і Расіяй яшчэ не заключаны. Усё вядуцца дыпламатычныя кансультацыі, а зацікаўленыя бакі абяцаюць прыняць усе меры для падпісання пагадненняў аб узаемных паездках грамадзян у найкарацейшы тэрмін — у канцы мая або на пачатку чэрвеня — з тым, каб да 1 ліпеня г.г. яны ўступілі ў сілу.

Польска-беларускія кансультацыі адбыліся ў Варшаве 12-13 мая г.г. У іх ходзе практычна ўзгоднены ўсе палажэнні будучага пагаднення. У прыватнасці, дасягнута дамоўленасць аб захаванні бязвізавага рэжыму паездак членаў экіпажаў марскіх і паветраных суднаў, а таксама для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія перамяшчаюцца транзітам у дзяржавы-ўдзельніцы Шэнгенскага пагаднення, Славакію, Чэхію, Вялікабрытанію, Ірландыю, Венгрыю.

Да гэтай пары беларуская звычайная віза каштуе 50, тэрміновая — 100 плюс 5 дол. банкаўскай аплаты, а транзітная — 70 дол. Польскі бок прапанаваў, каб візы для грамадзян абедзвюх краін каштавалі як найменш: аднакратныя — некалькі, а гадавая шматкратная — 20-30 еўра. Аднак беларускі бок аддаў перавагу не выгадзе падарожных, а прыбытку, і ў праекце пагаднення запісана цану аднакратнай візы ў памеры 10 еўра, гадавой шматкратнай — 50 еўра.

З мэтай спрашчэння працэдуры прадугледжана выдача віз без запрашэнняў. Аднак пры ўездзе на тэрыторыю Польшчы і Беларусі грамадзяне абавязаны распараджацца грашовымі сродкамі неабходнымі для аплаты расходаў па прабыванні ў краіне накіравання або дакументамі, пацвярджаючымі мэту паездкі і тэрміны мяркуемага прабывання.

У адпаведнасці з праектам пагаднення бясплатныя візы атрымаюць грамадзяне ва ўзросце да 16 гадоў, а таксама ва ўзросце 65 гадоў і больш, інваліды, студэнты і выкладчыкі, удзельнікі мерапрыемстваў асветнага, культурнага, навукова-тэхнічнага і спартыўнага характару, грамадзяне наведваючыя месцы пахавання сваякоў, члены нацыянальных спартыўных каманд, сябры рабочых органаў еўрарэгіёнаў „Нёман", „Буг" і „Белавежская пушча". Льготныя на 50% візы могуць атрымаць грамадзяне, якія падарожнічаюць з мэтай падтрымкі сямейных кантактаў, у прыватнасці, для наведання бацькоў, дзяцей, родных братоў і сясцёр, бабуль, дзядоў, унукаў, мужа і жонкі.

У Беларусі польскія візы выдаваць будуць консульствы ў Мінску, Гродне і Брэсце. Мяркуецца, што выдаваць яны будуць каля 280 тысяч віз у год. Беларускія візы польскія грамадзяне змогуць атрымаць у консульствах у Варшаве, Беластоку, Гданьску і Белай-Падляшскай.

(вл)

Польска-беларуская Акадэмія новай Еўропы

У рамках праекта „Акадэмія новай Еўропы" 16 мая Бабруйск наведалі прадстаўнікі шасці грамадскіх арганізацый з Вроцлава. Рэалізацыя супольнага польска-беларускага праекта, мэта якога — развіццё партнёрскіх дачыненняў, пачалася яшчэ ў лютым. Тады беларускія ўдзельнікі праекта наведалі Вроцлаў.

І вось цяпер адбыўся візіт у адказ. Шасцёра прадстаўнікоў чатырох недзяржаўных арганізацый Вроцлава — „Людзі — людзям", „Калегіум Усходняй Еўропы", „Саюз гарцэраў", „Дом спаткання Ангеліуса Селезіуса" цягам дня знаёміліся з дзейнасцю школьнай рады ў Сярэдняй школе № 8, сустрэліся з журналістамі газет „Бобруйский курьер" і „Крынічка бабруйская". Польскія госці наведалі офіс Беларускага таварыства інвалідаў.

Кіраўнік аб'яднання „Людзі — людзям" Эразм Гуменны і адзін з кіраўнікоў праекта „Польска-беларуская Акадэмія новай Еўропы"Алег Сівец наведалі яшчэ Бялынічы. Яны сустрэліся са старшынёй раённага таварыства Чырвоны крыж Наталляй Герынг, пазнаёміліся з умовамі функцыянавання мясцовай дапаможнай школы — інтэрната для дзяцей сіротаў і Дома для састарэлых і інвалідаў. Адбылася сустрэча польскіх гасцей з кіраўніком бялыніцкага аддзялення дабрачыннага фонду „Дзецям Чарнобыля" А. Дунчанкам, які займаецца праблемамі аздараўлення юных бялынічан і аказаннем гуманітарнай дапамогі сем'ям, што апынуліся за рысай беднасці.

Падчас сустрэч з беларускімі недзяржаўнымі арганізацыямі абмяркоўваліся накірункі супрацоўніцтва ў сацыяльнай сферы і пераймання напрацаванага досведу як беларускім бокам, гэтак і польскім.

„Тыдзень з Магілёўскай вобласьцю", № 19 (86)

Чарнобыльскі запаведнік

7 мая г.г. у Ольштыне пабываў віцэміністр лясной гаспадаркі Беларусі Мікалай Юшкевіч. Расказваў ён пра выследкі чарнобыльскай аварыі ў лясах.

Найбольш забруджаныя абшары закрыты. На даязных дарогах пастаўлены шлагбаумы і дарожныя знакі, забараняючыя ўезд, але ніхто гэтаму не падпарадкоўваецца. На гэтых абшарах не вядзецца гаспадарчая дзейнасць, яны з'яўляюцца зонай нацыянальнага парку. Забруджана каля 20% тэрыторыі Беларусі, але Чарнобыльскі парк ахоплівае каля 5% яе тэрыторыі. Мы ведаем, што дзеецца ў тых лясах. Дзякуючы дапамозе Сусветнага банка вядзем з дваццаці сама- і верталётаў маніторынг пажараў і хвароб лесу. Таксама са спутнікаў наглядаем за ўзроўнем радыяцыі. У запаведніку зарастае натуральны лес, жыве там многа звярыны. Калі на тыя абшары, забруджаныя цэзіем-137 і стронцыем-90, змогуць уваходзіць людзі — залежыць ад вучоных. Інстытут лясоў у Гомелі супрацоўнічае з даследчыкамі з многіх краін. Вядома, напрыклад, што ўнутраныя слаі дрэва значна менш забруджаныя за вонкавыя і абрэзваючы апошнія, можна такою драўнінай карыстацца.

Андрэй Гаўрылюк

Дом без фундамента

Мінула акурат восем гадоў з часоў першага агульнабеларускага рэферэндуму, вынікам якога стала не проста вяртанне крыху змененых старых камуністычных сімвалаў краіны і страта беларускай мовай пазіцыі адзінай дзяржаўнай. Як паказвае ход далейшых падзей, рэферэндум 14 мая 1995 года стаў пачаткам змены палітычнага курсу Беларусі. І сёлета такі курс прыдбаў новы, да смешнага супярэчлівы чыннік.

Першыя гады існавання незалежнай Беларусі былі характэрныя паўнейшай дэзарыентаванасцю як насельніцтва, так і ўлад да перспектыў далейшага развіцця краіны. У многім згуляла тут не надта добрую ролю сама нечаканая незалежнасць, якая стала вынікам не змагання, а палітычных падзей вакол беларускай рэспублікі. Камуністычная ідэалогія ўжо доўгія гады была не тое, што ненавідзімай, а па-просту мала каму цікавай, з чаго мала кім падтрымліваемай. Нацыянальна-патрыятычны ўздым канца 80-х — пачатку 90-х пайшоў на спад з-за неразумення каштоўнасцей нацыянальна-дзяржаўнай самастойнасці Беларусі большасцю яе насельніцтва. Прага па ранейшых, можа дрэнных, але зразумелых парадках і танных таварах выводзіла формулу „Навошта мне ваша беларуская мова, калі няма чым напоўніць страўнік?!" А ківанне на разарваныя эканамічныя сувязі з былымі савецкімі рэспублікамі стала асноўным тлумачэннем усіх бед грамадзян незалежнай Беларусі.

Менавіта ў такіх умовах і стала магчымым правядзенне рэферэндуму, які меў на мэце дэманстрацыю нядаўна абранага прэзідэнта вярнуць усё „добрае", што было ў беларускага грамадства яшчэ 10 гадоў таму. А да таго ж ідэйна разграміць ужо слабеючы, але ж яшчэ маючы даволі сур'ёзную падтрымку ў часткі людзей Беларускі народны фронт, які быў асноўным носьбітам ідэі беларускай дзяржаўнасці і незалежнасці. З пазіцый сённяшняга дня можна прызнаць, што А. Лукашэнку і ягонаму атачэнню гэта ўдалося. Нягледзячы на неблагі для БНФ вынік на прэзідэнцкіх выбарах 1994 года — Зянон Пазьняк заняў трэцяе месца, маючы патрымку каля 17% галасаваўшых — у 1995 годзе ў беларускі парламент не трапіў ніводзін прадстаўнік Фронту.

Прэзідэнцкая ўлада перамагла тых, каго называла „нацыянал-радыкаламі" ідэйна, выкарыстаўшы настальгію людзей па нядаўнім мінулым. Звяржэнне гістарычнай сімволікі, рэзкае звужэнне выкарыстання беларускай мовы, абяцанне хуткага як эканамічнага, так і палітычнага аб'яднання з Расіяй мусіла мець свой лагічны працяг, вынікам якога павіна было стаць узнясенне галоўнага ініцыятара рэферэндуму А. Лукашэнкі туды, куды заўсёды імкнуўся беларускі савецкі партыйны чыноўнік — у Маскву. Але ў даным выпадку не ў якасці запрошанага на працу простага наменклатуршчыка, а ў ролі галоўнага інтэгратара і аб'яднальніка „абноўленага" саюза. Наступны рэферэндум 1996 года стаў палітычным умацаваннем пазіцый беларускага прэзідэнта, які пазбавіў сябе якой-кольвек супрацьвагі.

Аднак час размеркаваў па-іншаму. На змену палітычна здрахнеламу Ельцыну ўладу ў Крамлі займеў малады, энергічны і незакамплексаваны кампартыйнымі традыцыямі Пуцін, КДБісцкае мінулае якога, па ўсёй верагоднасці, дазваляе яму бачыць прычыны інтэгратарскіх памкненняў амбіцыйнага беларускага лідэра — колішняга дырэктара саўгаса.

Новыя рэаліі расійска-беларускіх дачыненняў найяскравей праявіліся летась. А сёлета беларускае грамадства пачула з вуснаў свайго прэзідэнта панегірыкі беларускай незалежнасці, якую варта мацаваць ідэйна.

Ідэалогія „дзяржаўнага патрыятызма" выспела ў галовах прадстаўнікоў выканаўчай улады і адцясніла на другі план „славянскае братэрства". Праўда, у ёй не знаходзіцца месца бел-чырвона-беламу сцягу і „Пагоні", аб прыярытэтэце развіцця беларускай мовы таксама не кажацца. Адкінуўшы шматвекавыя здабыткі продкаў, цяперашняе кіраўніцтва Беларусі са сваёй ідэалогіяй аказалася ў ролі будаўнікоў, што будуюць дом без фундамента. Магчыма, у такой працы маецца пэўны сэнс — з аднаго боку ёсць імітацыя актыўных намаганняў, а з другога — пры неабходнасці такую пабудову можна лёгка разабраць. Але сапраўдным падмуркам беларускай незалежнасці могуць стаць толькі пранесеныя праз стагоддзі гістарычныя сімвалы і ўсё, што з імі звязана. Пакуль, на жаль, гэтага не разумеюць, а можа не хочуць разумець „будаўнікі". І таму зараз з'яўленне на вуліцы з нацыянальнай „незарэгістраванай" сімволікай нясе для чалавека небяспеку судовага пакарання.

Уладзімір Лапцэвіч

Будзе ўстаноўлены мемарыяльны знак Міхалу Валовічу

У жніўні мінулага года слонімскі гісторык, аўтар кнігі „Парэчча" Аляксандр Талерчык, які пражывае ў Гродне, звярнуўся з заявай ў Слонімскі райвыканкам з прапановаю ўстанавіць на вясковых могілках у вёсцы Парэчча мемарыяльны знак Міхалу Валовічу (1806-1833).

Нядаўна ён атрымаў станоўчае рашэнне Слонімскага райвыканкама на ўстаноўку мемарыяльнага знака і творчая інтэлігенцыя Слонімшчыны плануе ўстанавіць яго летам.

Міхал Валовіч нарадзіўся ў маёнтку Парэчча Слонімскага павета. Ён быў з беларускага шляхецкага роду Валовічаў. Падчас вучобы ў Віленскім універсітэце (1822-1825) быў блізкі да тайнага Таварыства філаматаў і філарэтаў. Удзельнічаў у паўстанні 1830-1831 гадоў у атрадзе генерала Гелгуда. Пасля задушэння паўстання рускім царызмам, эмігрыраваў у Францыю. Уваходзіў у эміграцкія палітычныя арганізацыі. Выступаў за адмену прыгоннага права, за абвяшчэнне Беларусі незалежнай дэмакратычнай рэспублікай. Удзельнічаў у Заліўскай экспедыцыі 1833 года. У сакавіку 1833 года ў якасці паўстанцкага начальніка Слонімскага і Навагрудскага паветаў прыбыў у Беларусь. Стварыў у наваколлі Слоніма партызанскі атрад з сялян. Праз два месяцы атрад быў разбіты рускімі войскамі, а Валовіч арыштаваны. Паводле прыгавору ваенна-палявога суда Валовіч быў павешаны ў Гродне.

Па ўспамінах старажылаў вёскі Парэчча, цела Міхала Валовіча яго маці перавезла ў Парэчча і пахавала на былых могілках, хаця дакладнае месца пахавання невядомае.

Сяргей Чыгрын

Фота ЯНІНЫ БРАУЛЬТ

Рабочая частка працягвалася за сяброўскім сталом. Яніна Кандрацюк другая справа

У Беластоку „адкрыюць вочы”

[1 ☞ працяг]

цей, у прэзентацыі нашай культуры Еўропе. Што можа паказаць ПШ н-р 4 у Беластоку? Нашу культуру, якая вельмі цікавая чалавеку з Захаду.

Праект адрасаваны настаўнікам і вучням і распісаны ён на тры гады. Яго мэта — развіццё і ўзбагачэнне школы.

— Што гэта канкрэтна абазначае?

— Кантакт са сваімі партнёрамі мы будзем ладзіць праз Інтэрнэт. Дзякуючы грошам з праекта (1 500 еўра) школа купіць інтэрнэт-камеру, і дзякуючы ёй мы будзем ладзіць кантакт з партнёрамі. Будзем паказваць нашы школьныя мерапрыемствы, поспехі, культурныя падзеі. Інтэрнэт-камера дае магчымасць весці міжнародныя канферэнцыі.

Паводле праекта, мы атрымаем таксама грошы на падарожжы ў краіны нашых партнёраў. Прадбачаны дзве паездкі ў год. Гэта шанц для дзяцей з бедных асяроддзяў, якім не пад сілу паехаць на ўласны кошт.

І яшчэ найважнейшае: бясплатны курс англійскай мовы для настаўнікаў! Заняткі, два разы ў тыдзень, на працягу двух гадоў.

* * *

— Ці вашы настаўнікі праявілі зацікаўленне праектам?

— Так. Мяне асабліва прыемна ўразіла тое, што ўсе, згодна, патрабавалі, каб уключыць у праект дзяцей з беларускай групы.

— Дык чаму ў нашым рэгіёне няма зацікаўлення адукацыйнымі праграмамі?

— У Беластоку мы думаем, што мы „на канцы” і ўжо нічога нявартыя. Саромеемся беднасці, наракаем. А вось у багатай Нямеччыне, у вясковых школах часта няма камп’ютэраў для карыстання дзецям. Мы баімся англійскай мовы — а тыя ж немцы, хаця і слаба ёю валодаюць, не маюць комплексаў, каб на ёй размаўляць. У багатай Даніі ёсць іншая праблема — дзеці нічога не ведаюць пра сваіх суседзяў, ды ў іх няма нават такой патрэбы. Сябра з Англіі гаварыў падобнае пра англічан — яны вельмі неахвотна вывучаюць замежныя мовы. Ім здаецца, што ўвесь свет ведае англійскую мову.

Нам няма чаго баяцца. А ў нашай школе, апрача польскай, ёсць англійская, нямецкая, беларуская, руская, царкоўнаславянская мовы. Англійскую мову ўжо вывучаем з першага класа. Ужо ў гімназіі можна авалодаць мовай.

* * *

Яніна Кандрацюк адзначае: настаўнікі з Захаду зацікаўлены супрацоўніцтвам з польскімі школамі. Яны здзіўляліся: чаму ад нас прыязджаюць выключна маладыя настаўніцы-англісткі? Мы, усе чатыры прадстаўніцы Польшчы, былі ва ўзросце да 30 гадоў, а з Нямеччыны і Англіі прыехалі настаўнікі да 60 гадоў, часта дырэктары. Аднак усе адчувалі сябе як у вялікай сям’і. Дасведчаныя валанцёры падзяліліся сваім вопытам і энтузіязмам.

— Знаёмства і кантакт са светам дае неацэнныя адукацыйныя карысці. Мне, — кажа Яніна, — залежыць на тым, каб з гэтага шанцу скарысталі нашы беларусы.

Пакуль што, у Пачатковай школе н-р 4 у Беластоку чакаюць грошай. Згодна з планам, праект рушыць з пачаткам новага навучальнага года. Праект „Адкрый вочы” ўзнік у лістападзе 2002 года, і першая сустрэча адбылася ў вёсцы Майшос каля Бона. Іх партнёры з Даніі атрымалі грошы і ўжо дзейнічаюць.

Ганна Кандрацюк

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў” друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб’ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з’яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

11 конкурснае пытанне

У якой школе рэалізуецца адукацыйны праект „Адкрый вочы”?

Адказ: .....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 8 чэрвеня 2003 г.)

Узнагароды…

… за правільны адказ на ***8-е конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Юстына Аўласюк** з Навакорніна, **Наталля Герасімюк** з Гайнаўкі і **Паўліна Мароз** з Новага Беразова.

Фота АНДЖЭЯ ЗГЕТА

Выступае Грузінскі мужчынскі гурт „Ломісі”

Фота ПЯТРА НЕМЧЫНОВІЧА

К. Пендэрэцкі віншуе М. Бушко з „моцным духам”

Майстэрства і духоўнасць

[1 ☞ працяг]

рыжоры Барыс Тэўлін і Кшыштаф Пендэрэцкі), Польскі камерны хор з Гданьска і Сімфанічны аркестр Беластоцкай філармоніі (дырыжор Марцін Налэнч-Несялоўскі). У ходзе конкурсных слуханняў выступіла 18 хораў, а ў іх ліку хоры з такіх, здавалася б, „мала праваслаўных” краін як Венгрыя ці Швецыя. Фестываль паволі набліжаецца да мерапрыемства, у якім сучасная класічная музыка займае ўсё большае месца. Рух такі патрэбны, — сцвердзіў старшыня журы Рамуальд Твардоўскі, — бо інакш усе мы сядзелі б у музычнай спадчыне XIX стагоддзя. Гала-канцэрт добра засведчыў пра гэтую змену вобліку — украінскі хор „Арэя” і хор Маскоўскай кансерваторыі падарылі публіцы багаты набор кампазіцый з-па-за „канону Фестывалю”.

Прысутнасць на Фестывалі К. Пендэрэцкага ў якасці артыстычнага патрона мерапрыемства, — адзначыла журы Фестывалю ў сваім завяршальным камунікаце (25 мая г.г.), — прыдала Фестывалю ранг падзеі сусветнага фармату. Журы пераканане, што за справай Фестывалю Беласток становіцца месцам еўрапейскіх харавых сустрэч Усходу і Захаду.

Аляксандр Максімюк

Узнагароджаныя хоры

Свецкія аматарскія хоры: I. Хор парафіі Св. Сафіі ў Штакгольме (Швецыя). II. Хор парафіі „Св. Злата Маглена” пры Македонскай праваслаўнай царкве, Скоп’е (Македонія).

Свецкія аматарскія хоры: I. Хор „Глорыя” Рэспубліканскага музычнага калегіума, Кішынёў (Малдавія). II. Хор „Collegium Musicum” Дзяржаўнага універсітэта прыгожых мастацтваў, Бялград (Сербія і Чарнагора). III. Хор Люблінскага каталіцкага універсітэта, Люблін. Вылучэнне: Маладзёжны хор „Детство” з Барысава (Беларусь).

Камерныя прафесійныя хоры: I. Мужчынскі хор „Радзівілы”, Мінск (Беларусь). II. Візантыйскі мужчынскі гурт „Св. Ефраім”, Будапешт (Венгрыя).

Прафесійныя хоры: I. Дзяржаўны хор Маскоўскай кансерваторыі імя П. Чайкоўскага (Расія). II. Харавая капэла „Арэя”, Жытомір (Украіна).

Вачыма паляка

Еўрасаюзны конь

У апошні час меў я нагоду кантактавацца і размаўляць даўжэй чым заўсёды з польскімі палітыкамі г.зв. „першага гарнітуру". Вядома, не ўдалося пазбегнуць пытанняў еўрасаюзнага рэферэндуму і ўваходу Польшчы ў ЕС. Так супала, што і рэферэндумная кампанія набрала маху. Пачала непасрэдна даходзіць да жыхароў Беластока і Падляшскага ваяводства не толькі ў час пленэрных фэстаў, але і шляхам платных рэкламных перадач па радыё і тэлебачанні. На жаль, засталося ўва мне ўражанне, што агулам 70 партый, таварыстваў і фондаў выкарыстоўвае дадзены ім час дзеля прапагандавання ўласных арганізацый і пасобных сваіх членаў. Раптам, на мой прынамсі здзіў, з'явіліся згуртаванні і людзі, у асноўным праеўрапейскія, занудлівыя, якія апроч агульных поглядаў не маюць чаго сказаць. У першыя дні кампаніі найцікавейшы матэрыял падрыхтавалі нейкія еўраскептыкі (тэндэнцыйна не скажу, хто яны). Падстаўленыя суразмоўцы адказвалі на пытанне, чаму яны за ўваход нашай краіны ў ЕС. У адказах, па словах Лешка Мілера, ашчадна гаспадарылі праўдай, аднак былі надта ж забаўныя. Такія, вось, прагучалі аргументы: „Я за Еўрасаюз, бо я беспрацоўны і нічога мне не хочацца рабіць", „бо выбраў я лепшае былое", а адзін таўсцячок дадаў: „Бо гэта найлепшы спосаб пахудзець". Умела бясплатны час выкарысталі некаторыя партыі, сярод іх Права і Справядлівасць, выказваючыся за ЕС і моцнай у ім Польшчай. Працінулі ў рэкламцы пры нагодзе некалькі іншых поглядаў гэтай апазіцыйнай да ўрада групоўкі, якая з цяжкасцю прабіваецца ў Сейме. Як кажуць палякі, ігра вартая свечкі. Урэшце ж, выбары ў Сенат і Сейм неўзабаве, можа нават і восенню, хоць, найбольш праўдападобна, што вясной наступнага года. Агульна, аднак, у большасці пераконваючыя галасаваць „за" і „супраць" — малацікавыя.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

З расчараваннем вяртаўся я адной суботы з праеўрапейскага пікніка, галоўным арганізатарам якога была перад палацам Браніцкіх у Беластоку Падляшская ваяводская ўправа. Праўда, выступалі папулярныя сярод моладзі гурты. Аднак, уся рэшта, асабліва тая, што асацыюецца са словам пікнік, не спраўдзілася. На шматлікіх плакатах, развешаных да мерапрыемства ва ўсім горадзе, прадбачвалася прэзентацыя (і спажыванне) страў еўрапейскай кухні. На жаль. Гадзіну пасля пачатку пікніка можна было пачаставацца крупнёкам, звычайнай каўбаскай, шашлыком і гарохавым супам. Прычым цэны маглі б канкурыраваць з еўрапейскімі. Малая порцыя (у 10 см.) кашанкі, два невялікія квашаныя агурочкі і дзве скібачкі хлеба каштавалі 7,59 зл., значыць, каля 2 еўра. Атракцыёнам было апетытнае печыва, якое прадавалі працаўнікі пякарні ў Кермусах пад Тыкоцінам. Хоць смачна выглядаў гэты добра выпечаны хлеб з цыбуляй і травамі, але больш асацыяваўся ён з традыцыяй далёка нееўрасаюзнай краіны, яго цана адпалохвала (3 і 5 зл.). Усё ж, быў гэта атракцыён, якога штодзень не знойдзеш у Беластоку. Таксама экзатычны, хоць сапраўды цікавы, быў фінскі дзень у падляшскай сталіцы. Невядома толькі чаму выбрана была якраз Фінляндыя для прапагандавання ўсяго Еўрасаюза.

Вернемся да вялікае палітыкі. Шанцы ў ЕС будуць мець маладыя людзі, дарэчы, яны ў большасці былі публікай мерапрыемства ля палаца Браніцкіх. Гавораць аб гэтым адным голасам еўраэнтузіясты ў рэкламках у тэлебачанні. І, несумненна, гэта праўда. Аднак, што будзе ад паловы будучага года, асабліва ў першыя гады пасля ўваходу ў ЕС, з сярэднім і старэйшым пакаленнем. Адзін вельмі ўплывовы палітык, у прыватнай размове сказаў мне адкрыта:

— Скарыстаюць маладыя людзі, старэйшаму пакаленню трэба будзе пагадзіцца. Але ж кожны хоча, каб ягоным дзецям жылося лепш.

Пасля прызнаўся ён, што намерваецца пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз адысці з палітыкі.

— Потым кіруючыя Польшчай будуць толькі адміністраваць дзяржавай.

І так сабе я пасля яго прызнання падумаў. Ну, добра, калі ён адыдзе, і тое ж зробіць большасць дасведчаных, разумных і вялікага класа палітыкаў, якая ўлада выдзяўбецца нам у гэтай еўрасаюзнай Польшчы? Можа, за адну з найважнейшых галін — гаспадарку, будзе адказваць дэпутатка ад „Самаабароны" Рэната Бэгер? Калі так, дык хто дасць гарантыю, што яна і яе палітычнае заплечча не спрабуюць пераесці еўрасаюзную дапамогу, быццам конь авёс, калі цытаваць іншае, найбольш інтымнае прызнанне тае дэпутаткі. Ды няма чаго апасацца! Еўрасаюзная сістэма кантролю спрацуе. Карацей: у Еўрасаюзе, які той конь ёсць, кожная еўрасаюзная краіна бачыць.

Мацей Халадоўскі

Еўропа не павінна быць...

Еўропа не павінна быць у будучыні такая як у мінулых стагоддзях. Пасвараныя еўрапейскія дзяржавы часта вялі паміж сабой войны, якія прыводзілі да спусташэння вялікіх абшараў кантынента. Тут пражывалі вялікія стваральнікі культуры і навукі, еўрапейская цывілізацыя заваявала абедзве Амерыкі, выхадцы з Еўропы пабудавалі магутнасць Злучаных Штатаў. З другога боку, народам Азіі і Афрыкі еўрапейцы прыносілі больш няшчасцяў чым карысці. Але найбольш ад актыўнасці сваіх лідэраў пацярпелі еўрапейскія народы. У XX стагоддзі тут пачаліся дзве сусветныя вайны, якія забралі дзесяткі мільёнаў ахвяр. У Еўропе нарадзіліся Гітлер і Ленін, якія прыдумалі тэхналогію вынішчэння вялікіх грамадскіх груп па ідэалагічных прычынах. Еўропа дала свету не толькі вялікіх вучоных, артыстаў, літаратараў, але і жахлівых злачынцаў.

Пасля II сусветнай вайны старыя народы Еўропы сталі шукаць шляхоў забеспячэння сваіх грамадстваў ад чарговай ваеннай катастрофы. Пры канцы саракавых гадоў заходнееўрапейскія палітыкі прыйшлі да высновы, што вайна бывае найчасцей прычынай нявырашаных гаспадарчых праблем і племянной прапаганды, якая шукала перш за ўсё адмоўных рысаў у суседзяў і перабольшвала станоўчы вобраз сваіх этнічных супольнасцей. Яднанне немцаў з іх суседзямі, асабліва з французамі, працягвалася дзесяцігоддзямі. Цяпер у гэтых народаў супольная валюта і гаспадарчыя інтарэсы. Адкрытыя межы для людзей і капіталу ўчынілі краіны Еўрасаюза найбольш стабільнымі і багатымі ў свеце. Нягледзячы на гаспадарчы крызіс, супольная еўрапейская валюта — еўра — пачынае займаць штораз шырэйшую прастору на нашай планеце. Нават у краінах узніклых у выніку распаду Савецкага Саюза, большасць фінансавых аперацый праводзіцца ў еўрапейскай валюце.

Развал савецкай імперыі даў усім былым васалам Масквы магчымасць выбару новых саюзнікаў і сваіх шляхоў развіцця. Усходнееўрапейскія народы і іх эліты жылі заўсёды са свядомасцю блізкага суседства „вялікага брата". У еўрапейскай уніі няма такога выразнага „брата", таму былыя сацыялістычныя краіны часцей з надзеяй глядзяць на Злучаныя Штаты Амерыкі, якія паводзяць сябе ў міжнароднай палітыцы як Савецкі Саюз у апошніх дзесяці гадах свайго існавання. Праблемай краін Усходняй Еўропы з'яўляецца адсутнасць Амерыкі ў іх гаспадарчым жыцці. Еўрасаюз цяпер галоўны гаспадарчы партнёр Польшчы і нішто не паказве на тое, што ў найбліжэйшы час будзе інакш.

Палітычныя і гаспадарчыя працэсы, якія праходзяць у Еўропе ў апошніх дзесяцігоддзях, спрыяюць узнікненню сістэмы агульнай бяспекі. Бяспека гэтая будуецца аднак не на раўнавазе страху, але на перакананні, што ў Еўропе ўсё можна дасягнуць дарогай кампрамісаў. Такая логіка патрабуе на практыцы часу, цярплівасці і вялікай палітычнай культуры. Пашырэнне Еўрасаюза на ўсход — гэта спроба прыцягнуць да такога мыслення эліты посткамуністычных краін. Іракскі крызіс паказаў аднак перавагу мыслення характэрнага камуністычным царыкам. Таму нават у такім плане працэс далучэння Польшчы да Еўропы можа цягнуцца доўгія гады. Значна большыя праблемы чакаюць на ніве эканоміі і перабудовы феадальнай традыцыі ў мяшчанскую.

Усходняя Еўропа пабудаваная на ідэйных фундаментах Каталіцкай і Праваслаўнай цэркваў. Гэтыя цэрквы фарміраваліся для рэлігійнага абслугоўвання феадальных грамадстваў. Заходнееўрапейскае мяшчанства стварыла для сваіх патрэб пратэстанцкія цэрквы. Там вырастала надта рацыянальнае грамадства, тут нават камуністычная адукацыйная сістэма выхоўвала пакаленні рамантыкаў гатовых пачынаць рэвалюцыю абы-дзе і супраць абы-каму.

7 і 8 чэрвеня палякі толькі могуць адкрыць для сябе чарговыя дзверы на дарозе ў Еўропу, але дарога туды яшчэ вельмі далёкая. Маюць шанц поўнасцю далучыцца да Еўропы толькі дзеці, якія цяпер пачынаюць хадзіць у школы. Праз год ці дзесяць мы ўсе будзем надалей усходнееўрапейцамі.

Яўген Мірановіч

Працуюць з вучнямі індывідуальна

У Падставовай школе ў Кленіках амаль усе вучні ходзяць на заняткі беларускай мовы. Настаўніца беларускай мовы Вера Фларчук карыстаецца новымі падручнікамі для навучання роднай мовы і беларускамоўнымі дапаможнікамі. У школьнай бібліятэцы багатай у беларускую літаратуру мала кніжак сучасных аўтараў.

— Я не раз прымала ўдзел у курсах у Гродне і Мінску. Адтуль прывезла я кніжкі, якія выкарыстоўваем на ўроках беларускай мовы. У час заняткаў з малодшымі дзеткамі выкарыстоўваем беларускія гульні, а са старэйшымі — літаратуру і агучаныя па-беларуску відэафільмы. На школьных мерапрыемствах ставім беларускія спектаклі, — заяўляе настаўніца беларускай мовы Вера Фларчук. — У нашай школе мала вучняў і таму можам адводзіць ім больш увагі. Некаторыя дзеткі загінулі б у вялікай школе, а ў нас працуем індывідуальна з кожным вучнем. З поспехамі цяжэй, бо няпроста сярод невялікай колькасці вучняў знайсці вельмі здольных дзяцей.

Аднак кожны год вучні дабіваюцца поспехаў у дэкламатарскіх конкурсах і конкурсе беларускай гавэнды. Самым вялікім школьным мерапрыемствам з'яўляюцца Адкрытыя дні школы. Дзеткі выступаюць тады перад бацькамі і наведвальнікамі школы. Вучні ездзяць на экскурсіі ў навакольныя вёскі, цікавяцца гісторыяй і расказамі старажылаў. Вучні падставовай школы ахвотна спяваюць, а некаторыя выпускнікі выступаюць у школьным калектыве „Гама", які дзейнічае пры Гімназіі ў Чыжах. Апошнім часам вучні і настаўнікі парадкавалі тэрыторыю вакол школы. Раней у школе праведзены былі рамонты.

Аляксей Мароз

Літаратурна-мастацкая старонка № 518

Уладзімір ГАРДЗЕЙКА

Ружа Касцюшкі

Косава. Зноў да цябе я прыехаў
Зноў Мерачоўшчыны глог уздыхнуў...
Чую — далёкае коціцца рэха
Гэта Касцюшка ідзе на вайну

Бачу — ідуць і ідуць касінеры
Нашай зямелькі каханай сыны
Гэта свабоды і волі жаўнеры
Як за радзіму змагаліся яны!

У бой іх вядзе легендарны Касцюшка
Як Балівар беларускай зямлі
Волі з Амерыкі, волі французскай
Так ён хацеў, каб свае ўзялі...

У сэрцы — памкненні такія высокія
Нібы на крылах здалёк прыляцеў
Ты для ўсіх найяснейшым быў сокалам
Ды наляцеў на крукоў у цемнаце

Рэшткі атрадаў у бітвах разбітыя
З болем такім адыходзяць за лес
Рэч Паспалітая, Рэч Паспалітая
Так загучаў у душы паланез

Край мой, бывай! О, туга невычэрпная
Вырас палын ў нашай шчырай сяўбе
У Пецярбургу зорка вячэрняя
Мне нагадала зноў пра цябе...

Літва мая! Я ад роду ліцьвінскага
Дзе б не бываў — заставаўся тваім
Мне нагадай паланезам Агінскага
Роднага коміна слодычны дым

Волі шукаў, пра яе толькі марыў ён
Нібы крыніца стаць хоча ракой
Але не волю — у далёкай Швейцарыі
Ён назаўсёды знайшоў свой спакой

Кропляй дажджу, песняй птушынаю
Вернешся зноў ты дамоў з чужыны
Дзікаю ружаю, белай шыпшынаю
Узгадкаю станеш далёкай вайны
.....

Ціхі фальварак. Не бачу я помніка
Што ж земляка не дало ўшанаваць?

Вось прыйшоў я самотным паломнікам
З днём нараджэння яго віншаваць

Я ўсё гляджу — здагадацца не здужаю
Што ж так туга раптам сэрца ўзяла
Белай шыпшынаю — дзікаю ружаю
Тут пра яго памяць зноў расцвіла

Ружа Касцюшкі — стагоддзі бурлівыя
Нам эстафету данеслі тваю
Нібы ля помніка с сэрцам шчаслівым
Ты мне дазволь — крыху я пастаю

Ружа Касцюшкі — шыпшына ты белая
Кроплі крыві так паметы на ёй
Мова твая надта мне зразумелая
Усе аб'яднаны мы гэтай крывёй

Бела-чырвоныя, чырвона-белыя
У неба ўздымаюцца нашы сцягі
Разам з Касцюшкам вырушым смела
Хай уздрыгнуцца ізноў варагі

Мы ўшанавалі сябра ці ворага?
Ружа дакорам вочы пячэ
Помнікі ставілі графу Суворову
Помнік Касцюшку паставім яшчэ!

11.05 — 5.08.2002, Камянец-Косава

Мал. КАЦЯРЫНЫ ВАЛКАВЫЦКАЙ

Анатоль КІРВЕЛЬ

Ліса

Яна сачыла за пеўнем з таго самага моманту, як ён, звёўшы курэй у гарод, ганарліва і трохі хрыпата падквохтваў — Ко-ко-ко! — разграбаючы грады адубелымі жаўтлявымі кіпцямі, нахіляў галаву і адным вокам узіркваўся ў неглыбокую цемнаватую ямінку, але не бачыў у ёй нічога вартага ўвагі, аднак зноў прыквохтваў — Ко-ко-ко! — запрашаючы курыц — мо яны што знойдуць, — а сам пёрся далей, у канец грады, пад самы плот, у якім была дзірка, схаваная густой травой, аднак певень не ведаў гэтага.

Гэта ведала ліса, бо сама падкапала ямку, каб зручней было дабрацца да пеўня. А той, ганарліва тупаючы па градах, нават не здагадваўся, што яго чакае.

Датупаўшы амаль да самай мяжы, ён прыўзняўся на кіпцях і гучна залапатаў крыламі, уздымаючы пыл з сухіх грудкоў — так хораша было адчуваць сябе дужым і непаўторным — гаспадаром гэтых бязмозглых квактух — патаптаць бы зараз якую! Хай во толькі апынуцца бліжэй!

І ў гэты момант ліса нячутна праслізнула ў шчыліну, спрытна перакусіла пеўню гарляк і пацягнула здабычу ў зробленую ёй дзірку...

На выгане, ужо ля самага лесу, яна раптам спынілася, натапырыла вушы, але праз момант супакоілася: з-за кустоў насустрач ёй падняўся ліс...

Вочы ў лісы ўспыхнулі зеленаватажоўтым агнём, поўсць на загрыўку стала дыбка, а тады ўляглася. Ліса няспешна давалакла пеўня да кустоў і паклала яго перад лісам. Матлянула галавой, праганяючы стому, потым хвастом, які ледзь прыкметна ўздрыгваў, і ціхенька цяўкнула, але ліс не адгукнуўся.

Яна абышла яго наўкол і, нібыта незнарок, лёгенька штурханула плечуком, а тады, наблізіўшы сваю мордачку да ягонай, церанулася аб яе — зноў-такі нібыта выпадкова — і пачала прынюхвацца... Вочы яе былі ўжо не зеленаватажоўтыя, а бурштынава-сонечныя... з лёгкім адценнем чырвані...

„Ну і ліса!" — падумаў ліс і павалок пеўня ў лес.

А ліса бегла побач, лёгенькая і зграбная: яна ведала, што сёння ў яе будзе падвойнае свята: спачатку — певень... а потым — ліс...

Драпежнік

Заяц уцякаў. Паджылкі яго трэсліся ад напружання, сіл заставалася мала, і было ўжо не да хітрыкаў: воўк таксама не дурань, і штораз апярэджваў зайца, разгадваючы ягоныя скокі...

Урэшце заяц канчаткова стаміўся і вырашыў скарыстаць апошні шанец: сіганўшы праз куст, чмякнуўся вобзем — у мяккі пушысты снег — і схаваў мордачку — каб ужо нішто не выдавала, што ён тутака, блізка...

Сэрца ліхаманкава калацілася ў ягоных распараных грудзях, але заяц не дыхаў, а прыціснутыя да тулава вушы чуйна лавілі любы шоргат, любы гук, які сведчыў бы пра небяспеку...

Нічагуткі!

Няўжо ўратаваўся?!

Заяц асцярожна расплюшчыў вочы і гэтак жа асцярожна падняў мордачку...

Лепей бы ён гэтага не рабіў! Насупраць яго спакойна сядзеў воўк і спакойна пазіраў на зайца.

Заяц устрапянуўся, хацеў маланкаю адскочыць убок, але не паспеў: кіпцюрастая ваўчыная лапа лупянула зайца па галаве, аглушыла, а калі заяц ачухаўся і хацеў аднавіць уцёкі, воўк ленавата паласнуў ікламі па зайцавай шыі і, лізнуўшы для прыліку свежую гарачую кроў, нечакана адвярнуўся і нетаропка патрусіў у той бок, адкуль і пачаў сваё паляванне: ён ужо даўно не хацеў ні мяса, ні крыві... бо — па сутнасці сваёй — ніколі не быў драпежнікам... Адно што майстрам сваёй справы...

Анатоль КІРВЕЛЬ

Адам СЯМЕНЧЫК

* * *

блакітнымі бываюць
нават звычайныя часткі сусвету
ты вырашаеш, хто ёсць БЛАКІТНЫ
седзячы ў сауне я перапоўнены радасцю
што пахудзею
мабыць нават на кілаграм
апускаю галаву і бачу
пупок сусвету

* * *

вызваляюся з няволі
уласных немагчымасцей
ужо не буду размыты
незгібальнасцю прынцыпаў
не буду бяспечна за імі хавацца
буду
пачынаць быць сабой

плоска ўяўленыя краты
могуць стаць існасцю чалавека

* * *

так цяжка гаварыць аб сабе
як цяжка думаць аб табе
дзесьці ўдалечы
у самоце
у зараз выключаным святле
здзяйсняем сон
аб каханні

* * *

дождж
які ўжо не ведаю
ідзе хіба знізу ўверх
атрутны
даводзіць да таго, што мой твар сплывае
аглядаючы мяне пры дзённым святле
траціш
канцэнтруеш сваю ўвагу на рэчах
непатрэбных
я не тут
у сімвале цішы
палаючай свячы
пачынаю жыць

* * *

не трэба рэзаць сабе вены
каб убачыць сваё нутро
хопіць сузіраць
выдзьмухнуты цыгарэтны дым

а можа лепш
замест
паўней
пайсці на шпацыр
у ранішняй імгле

Пераклад Міры ЛУКШЫ

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

* * *

Я вызваліўся з Аўшвіц.
І пута маё засталося
ў гэтым чымсьці,
пра што я толькі мрою
(толькі, толькі, ізноў — толькі!).
Бо я ўжо не герой
і не завуць мяне Мацвей,
а Мацей,
ані нават Ротэнберг.

Юбілейная канферэнцыя „Белавежы"

Управа Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", Інстытут усходнеславянскай філалогіі Філалагічнага факультэта Універсітэта ў Беластоку запрашаюць **8 чэрвеня на міжнародную навуковую канферэнцыю на 45-годдзе Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа"**. Праводзіцца яна будзе ў будынку Універсітэта ў Беластоку, Універсітэцкі пляц, 1 (былы дом ПАРП).

10.00 — Ян Чыквін, *Слова старшыні літаб'яднання*

10.20 — Галіна Твараковіч (Беласток), *Стылёва-эстэтычныя асаблівасці беларускай літаратуры ў Польшчы*

10.50 — Вольга Шынкарэнка (Гомель), *Георгій Валкавыцкі пра сябе і свет*

11.10 — Уладзімір Гніламёдаў (Мінск), *Сакрат Яновіч: маштабы таленту і асобы*

11.30 — Пятро Васючэнка (Мінск), *Абрысы мастацкага свету Сакрата Яновіча (хранатоп, іронія, сімвал)*

11.50 — Людміла Сінькова (Мінск), *Чалавек і гісторыя ў мемуарах Янкі Жамойціна*

12.10 — Галіна Тычка, *Проза Міхася Андрасюка: пошукі новых шляхоў мастацкага асэнсавання жыцця*

12.30 — Алесь Макарэвіч (Магілёў), *Жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы Міры Лукшы*

12.30 — 15.30 — дыскусія.

15.00 — Ванда Супа (Беласток), *Sentencje mądrościowe w prozie „białowiezan"*

15.20 — Базылі Сегень, *Дыялектнае слова ў літаратурнай мове (да характарыстыкі творчасці „белавежцаў")*

15.40 — Ала Брадзіхіна (Гомель), *Інтымная лірыка ў „белавежскай" паэзіі*

16.00 — Анатоль Раманчук (Гродна), *Лірыка Міхася Шаховіча*

16.20 — Зоя Мельнікава (Брэст), *Часопіс „Тэрмапілы" і сучасны беларускі літаратурны працэс*

16.40 — 17.40 — дыскусія.

(лук)

Зорка

старонка для дзяцей

Як святкавалі Міжнародны дзень дзіцяці?

1 чэрвеня — Міжнародны дзень дзіцяці. Традыцыя святкавання на Беласточыне адносна маладая. Напрыклад, усе мае аднагодкі Свята дзіцяці спалучаюць са святам спорту. Зараз святкуюць не толькі ў школе — традыцыя прынялася і ў сям'і.

Падзяліцца ўспамінамі мы папрасілі супрацоўнікаў „Нівы":

Віталь Луба — галоўны рэдактар:

— Такога свята мы не ведалі. Я вучыўся ў Пачатковай школе ў Чорнай-Вялікай, у 1954-1961 гадах. Са школьных веснавых мерапрыемстваў памятаю 1 Мая. Нас ставілі ў „чацвёркі" і мы са сцягам хадзілі навокал школьнай пляцоўкі. Наш марш меў напамінаць першамайскія шэсці, якія ладзілі ў вялікіх гарадах.

Яўгенія Палоцкая — машыністка і карэктар:

— 1 чэрвеня быў звычайным днём у школе, у сям'і таксама не ведалі пра такое свята. — Пані Геня вучылася ў Пачатковай школе ў Новай Волі ў 1957-1964 гадах. — Са школы памятаю толькі 1 Мая, — дадае.

Галіна Рамашка — кіраўнік канцылярыі:

— Дзень дзіцяці мне спалучаецца са Святам спорту. Мы хадзілі на стадыён, на якім прадпрыемствы арганізавалі спартыўныя спаборніцтвы. Ладзілі нам пачастунак, былі розныя конкурсы. Пані Галіна хадзіла ў бельскую „тройку" ў 1965-1973 гадах.

Поля Рэмбач з Беластока

Міра Лукша — журналістка, рэдактар літстаронкі:

— У нас таксама святкавалі Дзень спорту. У гэты дзень школай *жондзіў* пан Валянцін Карпюк, настаўнік фізкультуры. Мы цэлы дзень бегалі, скакалі, адзін хлопец хадзіў на ліне (!). У час аднаго такога свята я грымнулася галавой у слуп. Я страціла прытомнасць, але мяне ачуцілі і ўсё было добра. Я хадзіла ў школу ў Семяноўцы ў 1965-1973 гг.

Аляксандр Максімюк — сакратар рэдакцыі:

— Гэты дзень я запамятаў таму, што не было ўрокаў у школе. У нас у Гародчыне, а потым у Кленіках (вучыўся я ў 1973-1981 гадах) таксама святкавалі Дзень спорту. Не памятаю, каб стаў я пераможцам якой-небудзь канкурэнцыі.

Валодзя Лапцэвіч — карэспандэнт:

— У Беларусі 1 чэрвеня пачыналіся канікулы. Усе жылі адпачынкам. З гэтага дня пачынаўся лагер — са школьных кабінетаў мы выносілі лаўкі і на іх месца ставілі раскладушкі з пасцеллю. Мы дабіраліся ў каманды і пад кірункам настаўніка працавалі і адпачывалі. Звычайна ў такім лагеры я пабываў месяц, два апошнія месяцы канікул праводзіў у піянерскім лагеры на Магілёўшчыне.

— Ці неяк асабліва запамятаўся табе Дзень дзіцяці?

— Мы гутарылі пра правы дзіцяці. Наогул, гэты дзень мне запамятаўся як сонечны, вясёлы.

Валодзя вучыўся ў ПШ н-р 5 у Магілёве ў 1978-1981 гадах.

Паўліна Шафран — студэнтка і карэспандэнтка:

— У школе нам давалі лепшы абед, многа яблык, марожанае. Адбываліся ўрачыстыя акадэміі, выступаў тэатр, нас вадзілі ў кіно або на экскурсію ў Пілікі лес. — Паўліна вучылася ў бельскай „тройцы" ў 1987-1995 гадах. — На Дзень дзіцяці бацькі мне купілі зялёны ровар маркі „Ромэт". Я не магла нацешыцца падарункам. Маё шчасце працягвалася толькі тры тыдні, бо бацька паехаў у *склеп* і там „свіснулі" мой ровар. Бацькі, вядома, купілі мне новы, аднак ён быў падарункам „na otarcie łez".

* * *

На канец прапануем вам, дарагія чытачы, **конкурс**. Напішыце, калі ласка, як зараз святкуюць у вашай школе і сям'і Дзень дзіцяці. Аўтары допісаў атрымаюць кніжныя ўзнагароды.

ЗОРКА

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Маладзёжны калектыў з Рыбалаў ставіць сцэнку „Купалле"

Малы верш

Мой малы верш —
невялікі,
немалы.
Толькі мой.
Мой верш —
мая адна мова.
Не ваша?
„Ці твой?"
Мой, толькі мой.
Маю мой
малы верш.
* * *
Чакаю і стаю,
стаю і чакаю.
Мой вялікі верш.
Кажа настаўніца:
„Не твой верш".
Не твая мова.
А я стаю і чакаю
Свайго верша.

Аня АРЦЯМЮК, VI „б" кл. ПШ у Ягуштове

Вясна, вясна...

Вясна, вясна,
ідзе вясна,
праўдзівая, сонечная.
Яшчэ не зусім зялёная,
не вечная.

Вясна, вясна,
наўкол вясна.
Цудоўная, радасная.

Заквітаюць кветкі
ў лясах і агародах.
Чорная зямля адкрываецца
і збітая ляжыць на грудках.

Жаўрукі спяваюць
на двары навокал.
Калі ідзеш дахаты —
І ты такая вясёлая.

Эмілія АНТАСЮК, Гімназія ў Гайнаўцы

Сяброўкі?

Заўсёды я з табой была.
Заўсёды — ніколі адна.
Мы разам ішлі ў зіму і лета.
Нам вельмі пасавала гэта.
Супольна пераходзілі экзамены жыцця.
Але ты праз яго не перайшла.
Адышла да іншай, можа — лепшай?
Адышла — ну і што?
Перакрэсліла столькі гадоў,
мар і сноў?
Толькі супольных спраў — няма.
Ужо не буду слёз выліваць.
Ужо не буду праз вас наракаць.
Але калі думаю пра тое,
успаміны ліюцца ракою.

Іаанна ДУНАЙ, III „б" кл. Гімназіі ў Гайнаўцы

Міхась

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міхась Хмялеўскі, VI кл. ПШ н-р 11 у Беластоку

Дэкламатар, Міхась Хмялеўскі з Беластока ўжо чарговы раз заваражыў сваім выступленнем сяброўак (хлопцы зайздросцілі). Міхась — актцёр. Ён цудоўна паводзіць сябе на сцэне. Сюжэт прадстаўляе словам, жэстам, мімікай. У яго выступленні заўсёды многа руху. Рэпертуар у Міхася амбітны, які дазваляе бліснуць на сцэне. Вось і рэцэпт на поспех!

Міхась Хмялеўскі — вучань шостага класа ПШ н-р 11 у Беластоку. З прадшколля вывучае беларускую мову. З дзіцячых гадоў ён выступаў на сцэне беларускага тэатра, які ставяць у беларуска-польскім прадшколлі н-р 14 у Беластоку. Тры гады назад Міхась стаў лаўрэатам гран-пры ў дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова". Дэкламаваў тады „Жывую граматыку" Артура Вольскага.

У 2003 годзе Міхась стаў лаўрэатам другога месца цэнтральнага этапу „Роднага слова". Выступіў у сваім стылі — унушальна і тэатральна. Пра поспех вырашыла таксама падборка рэпертуару. Ён дэкламаваў верш Васіля Віткі „Доктар нос".

З верасня г.г. Міхась пойдзе ў гімназію. Мабыць, зноў сустрэнемся на дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова".

ЗОРКА

Дуб

Дуб любілі і шанавалі амаль усе народы. Славяне, грэкі, рымляне яшчэ ў вытокаў сваёй гісторыі пакланяліся гэтаму дрэву, узрост якога нярэдка перавышаў 1500 год. Яны прыпісвалі дубу цудадзейныя ўласцівасці. Складалі пра яго міфы, легенды, песні. У Грэцыі дубовая галінка ўвасабляла моц, магутнасць і знатнасць. Дубовымі вянкамі ўзнагароджвалі воінаў, якія здзяйснялі подзвігі.

У Старажытным Рыме дуб прысвячаўся богу Юпіцеру, а жалуды называліся боскімі пладамі.

Рымляне і славяне адносілі дуб да ліку святых дрэў, прысвячаючы яго богу грому і маланкі Перуну.

У старажытных летапісах можна сустрэць упамінанне аб Перуновым дрэве. Пад дубамі прыносілі ахвяры багам, збіраліся вайсковыя саветы, вырашалі дзяржаўныя справы.

З'яўленне хлеба ў сярэдніх шыротах людзі абавязаны дубу. Першы хлеб людзі пачыналі пячы не з пшаніцы ці жыта, а перамолвалі на муку дубовыя жалуды.

Сёння найбольш старым дрэвам Еўропы лічаць амаль 2000-гадовы дуб „Стары", які расце ў Літве, у мястэчку Стэльмужэ.

Вёска Альхоўка

Даўным-даўно ў вялікім драўляным доме жыў багаты пан. Цяжка было падлічыць яго багацце і змерыць яго палі. Быў ён багаты і вельмі скупы. Не шанаваў людзей, якія для яго працавалі, біў іх і зневажаў. Адзін яго слуга не хацеў больш цярпець і пайшоў шукаць сабе новага месца. Ноччу, калі ўсе спалі, мужчына з жонкаю і пяццю сынамі ўцяклі з двара. Пан не шукаў іх, яго не цікавіў іх лёс. Бежанец непадалёк панскага двара, у альховым лесе, пачаў будаваць свой дом з альховага дрэва. Яго сыны раслі і жаніліся. Пасля раслі і жаніліся іх дзеці, і, як грыбы пасля дажджу, раслі новыя хаткі. Месца гэтае людзі назвалі Альхоўкай.

Апісаныя здарэнні адбыліся ў XVIII стагоддзі. У 1786 г. першы раз упамінаецца пра вёску Альхоўку, якая належыла фальварку Нараўка.

У міжваенны перыяд у Альхоўцы існавала ячэйка Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Да вайны пражывала тут 380 чалавек.

30 ліпеня 1941 г. у вёску прыехалі немцы і загадалі людзям пакінуць свае хаты. Дазволілі ўзяць з сабою карову, малое парася, вопратку і крыху дроў. 70 дамоў і 145 гаспадарчых будынкаў немцы спалілі. Апошнія, у тым ліку мясцовая школа, сталі памяшканнямі для акупацыйных улад. Для пяцідзесяці чалавек прыйшлося пакінуць радзіму і ехаць на прымусовыя работы ў Нямеччыну.

Пасля вайны вёска адбудавалася. У 1979 г. Альхоўка налічвала 73 гаспадаркі. Зараз пражывае тут каля 150 чалавек.

Інфармацыю апрацавала Наталля РАМАНЧУК, I кл. Гімназіі ў Нараўцы; пра мінулае вёскі расказаў ёй прадзед Ян Раманчук

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Францішак Багушэвіч

Сябры-паўстанцы

Калі пачалося паўстанне Кастуся Каліноўскага, Багушэвіч разам з братам Валяр'янам без ваганняў узяў у рукі зброю. Ён ваяваў за вызваленне Бацькаўшчыны ў аддзеле, які ўзначальваў адважны паўстанцкі камандзір Людвік Нарбут. Гэты аддзел паспяхова змагаўся з расійскімі карнікамі ў наваколлі горада Ліды. Паўстанцаў падтрымлівалі беларускія сяляне. Разам з Багушэвічам ваяваў мастак Міхал Андрыёлі. Па нацыянальнасці ён быў італьянец, але сваёй радзімай лічыў Беларусь.

Паўстанцамі ў гераічны 1863 год сталі і гімназічныя сябры Багушэвіча. За зброю ўзяліся тады ўсе лепшыя людзі нашага народа. Яны рызыкавалі сваім жыццём, каб паказаць свету, што Беларусь не стала перад Расіяй на калені і хоча быць свабоднай еўрапейскай краінай. Пра гэта паўстанцы спявалі ў сваіх песнях. Некаторыя з тых песняў напісаў Францішак Багушэвіч, у якога ўжо абудзіўся паэтычны талент.

Цар кінуў на паўстанцаў велізарную, добра ўзброеную армію. Супроць аднаго беларуса ваявала дзесяць, дваццаць, а часам і сто расійскіх салдатаў. У няроўным баі загінуў Людвік Нарбут. У Вільні карнікі схапілі і расстралялі сябра Багушэвіча Ціта Далеўскага.

(працяг будзе)

Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 18: Ложак, бал, рыса, брат, вянок, казак. Корак, жыта, пас, кава, збан, кліка.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Іаанна Герасімюк** і **Іаанна Галёнка** з Арэшкава, **Лукаш Пракапюк**, **Данель Герасімюк**, **Іаанна Раманюк** і **Агнешка Леўчук** з Новага Корніна. Віншуем!



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Оля, Марыся, Ліда, Жэня і Міхал памятаюць, як калісь празываліся акалічныя вёскі

Навасады ў Дзень перамогі

Перад поўднем машына, з якой выкідваюць мяне калегі, што едуць у Цісоўку ў Міхалоўскай гміне, з енкам шын прытрымліваецца пасярод вёскі, на брукаванцы. З Шымак ехалі мы па свежым асфальце, з восенні пакладзеным, мінаючы апусцелыя лавачкі пад яшчэ цвітучымі слівамі і яблыневым цветам яшчэ неразвінутым. Тут, далей на ўсход, вясна крышачку спазняецца. Яшчэ можна ёю палюбавацца. Час ёсць. Жыць можна. У вёсцы амаль усе пенсіянеры. На дваццаці пяці хутарах і ў самой вёсцы-вуліцоўцы, званай калісьці „палюлікі". А навакольныя вёскі, вось, так: Цісоўка — „п'явачнікі", Залешане — „цыбульнікі", Ялоўка — „грыбнікі", Шымкі — „ядуны". Яшчэ ўсё памятаюць старыя мянушкі. А тыя, хто памятае, сёння на лавачкі вылеглі. Як на заказ. І пакуль дайду да пачатку вёскі, дзе стаіць дагледжаная гаспадарка Любы і Сашы Бяленяў, званых Рубчэўскімі, Любу паведамляюць: ідзе Лукшанка, першы раз па Навасадах у жыцці, пасвойму гаворыць, от, добрае дзіця, не ўстыдаецца. А гэта, кажа потым Люба, тут людзям падабаецца.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Добро пагаварылі! — усміхаецца Альбіна Салавей

Сяргей Зюзя, новы солтыс, што жыве ў другім канцы вёскі, управіўшыся з каровамі, калі мы заселі ў салоне, пералічвае, што тут у Навасадах ёсць. Нумароў хат — 111, разам з калёніямі. Раз не спаў, лічыў у памяці сваіх людзей. Разам 170 чалавек, з дзяцьмі. Дзяцей 12, маленькія ёсць таксама. У школу ў Шымках ездзяць. Найбольш Кардашоў, Павільчаў, Гайдучэняў, Салаўёў, Стэфановічаў, пару Зюзяў. І ўсе камбайны пералічыў Сяргей Зюзя — чатыры штукі, адна, пятая, „Вістуля". Трактароў 24, некаторыя маюць і па два. Коней гадуюць, солтыс з жонкай Янінай, гаспадар-арандатар, таксама трымае каня. Авечкі ні аднае. Зямлю робяць у Навасадскім салэцтве ў адной трацінє, на рэшце — буш, у Земляробчым агенцве. Бяры, рабі дзе хочаш; тое агенцтва, нават, пэўна, і не ведае, дзе тая ягоная зямля. Шасцёх па дагаворы з агенцтвам арандуе зямлю. Хто хоча, хай бярэ, менш ці больш, колькі трэба. Купляюць чужыя кавалак, ды якія гэта сяляне, — каб на ЗУС не плаціць страховак, а ў КРУСе, танней. Пенсійныя складчыны аплачвае толькі 10 асоб, а ёсць такія, што і складчын не плацяць, і падаткаў не аддаюць, бо з чаго...

Солтыс кажа, бядовая справа цяпер на вёсцы. Як усюды. Калісь то пайшоў бы ў які камітэт, калі што не так. Цяпер толькі аблясіць вёску, рэшта вымра, *і спокуй*. Хоць старыя пра тую Вунію адзін з адным перапытваюць, то што ім — абы *рэнты* не сарвалі. Бо як тут з таго малака выжывеш — МІТЕХ упаў, грошай не выплаціў, бо ж сяляне заўжды на канцы; Гайнаўка забірае. Ды за які грош! Агратурызм? Эт, не будзе такога ў гэтай ваколіцы. Адна сям'я, настаўнікаў з Шымак, маладых, будуецца тутака, мяркуюць інвеставаць у будучыню. Рэшта маладых раз'ехалася па свеце, па ўсянюткім, нават у Амерыку перасяліліся. Свет блізка цяпер... Калі патрабаваць чаго ад свету, дык можаш і дабіцца. Вось, *палякі* патрабавалі, і ў Залешаны ідзе аўтобус, беластоцкі, каб завезці людзей у касцёл.

Зайшла пазваніць ад солтыса ў школу, у Агульнаадукацыйны ліцэй н-р VI у Беластоку, маці Эвы і Монікі Лешчук. Сумнаватая маладзіца. Магла б, кажа, дзяўчат паслаць у ліцэй у Міхалове, ды калі зімой завее дарогі, то і ў школу не даедзеш. Канец свету. Пад ціўкатанне ў сенях учора прывезеных куранят ды індычанят (пані Яніна гадуе шмат птушак для сябе), якія трэба ўзяць пад лямпу, солтыс (якому больш за 70 гадоў, хоць выглядае на гадоў дваццаць маладзей) раптам пачынае пералічваць маіх сваякоў у ваколіцы — ад Цісоўкі па Раманава. Усюды ж людзі адзін аднаго ведаюць. Жыць хочуць нармальна. Калісь мелі грошы. Адчувалі сябе больш бяспечна.

— Не наша справа — пераваротышмоты, — кажа Сяргей Зюзя. — Ніхто не скажа, каго мы маем любіць. Чаго то рускіх не любяць? Мяжу зачыніць хоча ў гэты бок той Еўрасаюз.

Род жонкі спадара Сяргея — Яніны — з Дрэчан. Гэта напрасткі пяць кіламетраў, у Беларусі.

Пра Еўрасаюз пытаюцца і на лавачках. Роўна ў поўдзень. Пасля ў лёгкай смузе рассеянага за хмаркамі сонца, у павевах араматнага ад развітай зелені ветрыку перад лёгкім дажджом, цёткі і дзядзькі раптам прападаюць. Толькі чуваць перастук — маладыя, што прыехалі да бацькоў, рамантуюць хаты. Прыгожыя дамы, з рэзбленымі аканіцамі і надваконнямі, сэйдынгу не бачу. У буяючай свежа-зялёнай траве пасвіцца конь... Дзядзька Мікалай Дудко, адзін з лепшых гаспадароў, на 17 гектарах, завіхаецца на падворку са сваімі сынамі. А што тут гаварыць пра гаспадарку! Робіш, бо трэба.

— Бульву пасадзілі? — маё пытанне для людзей на лавачках гучала, пэўна, як пытанне майго калегі Здзіська ў вёсцы пад Саколкай. Толькі што Здзісек пытаўся быў у краме ў падвыпіўшых кампаньёнаў: „Авёс пажалі?". Увогуле, і тут былі асобы, якія зліньваліся з лавачкі, каб, мабыць, не трапіць у фотаапарат. Пасадзілі! І шырока ўсміхаліся. От, добро пагаварылі! — успамінае Альбіна Салавей, жонка Людвіка; яны — другая пара каталікоў, якая пражывае ў Навасадах. Хто куды выбыў, як там дзеці ў свеце жывуць. Як то весяло было, як цісоўскія Лукшы іграліі. Што на сэрцо лягло. Як цяжка жывецца Любе і Сашу, такім добрым людзям. „Ня ўсім ест добро". Што там іншыя *бядовыя справы*!

Міра Лукша

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

От, бядовая справа! — наракае Сяргей Зюзя

Юбілейны агляд абрадавых сцэнак

17 мая г.г. у Гарадку адбыўся X Агляд беларускіх абрадавых сцэнак. Прыехала дваццаць самадзейных калектываў з Беластоцкага, Бельскага і Гайнаўскага паветаў. Ставілі яны найчасцей адведкі, хрысціны, прыданне, сваты, розгляды ды вяселле (чарговасць паводле колькасці сцэнак). Было таксама гуканне вясны, Купалле і жніўны абрад — дажынкі з перапёлкай.

Гэтага роду мерапрыемства ўсё ўзбагачаецца: у 1995 годзе ў гэткім аглядзе ў Нарваўскім асяродку культуры ўдзельнічалі чатыры фальклорныя калектывы: з Паўлаў, Краснага Сяла, Старога Ляўкова і Тыневічаў-Вялікіх, дык у мінулым годзе ў Гарадоцкім асяродку культуры — ужо пятнаццаць.

Сёлета на юбілейным аглядзе былі прысутныя, між іншым, Леанід Каравайка — генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку, старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства Ян Сычэўскі, войт Гарадоцкай гміны — Веслаў Кулеша, радныя Гарадоцкай гміны, дырэктары мясцовых школ і г.д.

І вось рассунуўся занавес перад сцэнай, а на ёй шматасабовы мастацкі калектыў „Рэчанька" з Козлікаў (Заблудаўская гміна) выступіў са сцэнкай „Сваты". Жанчыны падрыхтавалі сцэнку пад кіраўніцтвам Алы Каменскай.

Затым маладзёжны гурт з Рыбалаўскага вясковага дома культуры ставіў абрадавае „Купалле". Яго рэжысіравала Лідзія Мартынюк.

Ішла ўжо другая гадзіна выступленняў на сцэне, але ніхто не адрываў вачэй, усе прагна слухалі. „Расспяваны Гарадок" якраз добра зарэкамендаваў сябе ў сцэнцы „Прыданне" (другі дзень вяселля), а за ім з „Адведкамі" выступілі жанчыны з Тыневічаў-Вялікіх. Жартоўныя песні і цікавая ігра вясковых акцёраў стварылі вясёлы настрой. Усё адбывалася так, як запланавалі кіраўнічкі калектываў: Ніна Цыванюк з Гарадка і Валянціна Франкоўская з Тыневічаў-Вялікіх. „Адведкі" ставілі яшчэ „Крыніца" з Беластока, „Малінка" з Маліннік і „Асенні ліст" з Гарадка. „Хрысціны" ставілі тры ансамблі: з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку, з Публічнай гімназіі ў Дубінах ды „Красуні" з Краснага Сяля. Нованароджаных дзяцей хрысцілі Антонам, Гаўрылам. Вядома, рэквізітамі былі замест дзіцяці адмысловыя лялькі. Навінкай быў амаль ужо забыты абрад „Траціны" (наведанне парадзіхі на трэці дзень пасля хрысцін). Сцэнку гэту падрыхтавалі „Журавінкі" з падсупрасльскіх Агароднічкаў.

З вясельным абрадам выступілі на гарадоцкай сцэне „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, „Чыжавяне" з Чыжоў (у іх выкананні была сцэнка „Розгляды"), „Каліна" з Дашоў і „Расспяваны Гарадок" (яны ставілі „Прыданне"). Усе яны праспявалі шмат даўніх абрадавых песень. „Арэшкі" з Арэшкава (Гайнаўская гміна) захапілі гледачоў песнямі прысвечанымі прыходу вясны — прызабытымі „вяснянкамі" або „агулькамі". Былі яшчэ жніўныя песні ў выкананні „Крыўчанак" з Крыўца (ставілі яны сцэнку з „Перапёлкай". Хацелася б добрым словам адзначыць шырокі ўдзел моладзі ў аглядзе абрадавых сцэнак. У многіх маладых прыродны талент. Мерапрыемства было ўдалае. Юбілейны агляд выявіў стыхію творчага нацыянальнага жыцця, невычэрпны талент беларускага народа.

Арганізатарамі X Агляду беларускіх мастацкіх абрадавых калектываў былі Галоўнае праўленне БГКТ у Беластоку і Гарадоцкі асяродак культуры. Канферанс вяла Валянціна Ласкевіч, сакратар ГП БГКТ.

Варта дадаць, што ўсе выканаўцы атрымалі рэчавыя ўзнагароды. Самадзейнікі і гледачы былі задаволены, што БГКТ ладзіць такія мерапрыемствы.

Янка Целушэцкі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Царква св. Мікалая Цудатворцы ў Бобры

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Фрэск „Судны дзень”

Цуд у Бобры (3)

Яшчэ ў Віцебску разам са славай скандаліста Пушкін прыдбаў сабе славу цудатворцы. Дзве іконы, якія ён рэстаўрываў для царквы св.св. Кірылы і Мяфодзія, пачалі міраточыць. Вестка пра цуд пайшла ў народ, пра мастака загаварылі ў глыбінцы.

Постсавецкія жывапісцы звышканфесійна глядзяць на сакральнае мастацтва. У адзін дзень могуць размалёўваць фрэскі ў касцёле і пісаць іконы ў царкве.

Пушкін адкрыта называе сябе праваслаўным артадоксам.

— Я — адзіны мужчына ў Бобры, які ходзіць кожную нядзелю ў царкву, — кажа сам пра сябе.

Сярод найважнейшых творчых дасягненяў Пушкін лічыць размалёўкі і аздабленне хрысціянскіх пабудоваў. Іншая справа — часам яны ўзбуджаюць здзіўленне або шок.

* * *

Пратэст і здзіўленне выклікаў фрэск „Глорыя кардыналу Свёнтку” ў магілёўскай архікатэдры Унебаўзяцця Найсвяцейшай Марыі Дзевы. Разам з групай жывапісцаў Пушкін прымаў там удзел у аднаўленні інтэр’ера касцёла. Кардынала „ўславіў” ён неадэкватна. Раней кардынал Свёнтак загадаў завесіць рызцём выявы бел-чырвона-белага сцяга, Канстытуцыю 1994 года і лідэра нацыяналістаў Зянона Пазьняка.

Па дарозе ў царкву жывапісец распавядае пра цяжкасці ў завяршэнні мясцовага роспісу фрэскаў:

— Тры разы слаў я мітрапаліту Філарэту прашэнне, каб блаславіў маю задуму, каб малітва „Ойча наш” у кнізе Стварыцеля была на беларускай мове. Гады ідуць, а адказу як не было, так няма. Людзі здзіўляюцца, пытаюць: „Саша, а чаму ў Пісанні белыя старонкі? Што гэта абазначае?”

Недакончаная фрэска ў сімвалічным месцы, у прытворы пад званіцай. Кожны наведвальнік у гэтым месцы спыняецца і глядзіць уверх. Фрэска прамаўляе як пратэст супраць адсутнасці беларускай мовы ў царкве.

* * *

У Бобры, былым мястэчку і зараз гарадскім пасёлку паўтары тысячы жыхароў. Праваслаўе трымаецца на жменьцы вернікаў, у большасці бабуль.

Трэба мець многа шчасця, каб патрапіць у сярэдзіну царквы св. Мікалая Цудатворцы. Мясцовы бацюшка марудзіць з адкрыццём і прэзентацыяй храма. Самыя ўпартыя фанаты дабіваюцца ў нядзелю, калі ідзе багаслужба.

— Наш бацюшка па нацыянальнасці рускі. Ён родам з Каўказа і не разбіраецца ў беларускіх „нацыяналізмах”, — паясняе мастак. — Для яго каб усё было „паціхонечку”.

Нам пашанцавала ўвайсці ў сярэдзіну, Алесь Пушкін сам адкрыў дзверы царквы.

Цэнтральнае месца ў інтэр’еры займае выява патрона — св. Міколы Цудатворцы. Святы плыве на чырвона-іржавым воблаку. Пад „крыллем” апекуна падарожнікаў сучасная дзея — па моры плаваюць судно і атамная лодка, з „неба” скача парашутнік і ляціць самалёт. Уражвае мастацкі прыём — праваслаўны канон спалучаецца з каталіцкім протарэнесансам і антысавецкім соц-артам. Дамінуюць улюбёныя колеры мастака: карычневы і шэра-блакітны — колеры дажджу і хлеба.

* * *

Каб пабачыць бобраўскі „цуд”, трэба азірнуцца на хоры. Фрэска „Судны дзень” займае ўсю заднюю сцяну. У пекле, у гурце грэшнікаў стаяць асобы падобныя на Аляксандра Лукашэнку і мітрапаліта.

Каб не зрабіць з сябе ахвяр перформенса як берасцейскія мытнікі, мы прыгадалі ўголас цікавы досвед. Чамусьці ў Шклове многія мужчыны здаваліся падобнымі, менавіта, на прэзідэнта.

— А як успрымаюць вашу фрэску прыхаджане? — пытаем Пушкіна, які з цікавасцю сочыць за нашымі назіраннямі.

— Нармальна, — чуем адказ. — Усё нармальна.

Доўгі час на фрэску ніхто не звяртаў у Бобры асаблівай увагі. Толькі калі па нядзелях пачалі сюды з’язджацца госці з Мінска ды аглядацца ў час багаслужбы, людзі задумаліся і пачалі наракаць: брыдка, калі народ у час багаслужбы азіраецца і смяецца!

* * *

Алесь Пушкін размаляваў царкву за ўласны кошт і сціплыя ахвяраванні прыхаджан. Фрэска не ашчаджае нікога: у пекле апынуліся ўсе прадстаўнікі постсавецкага грамадства: калгаснік, матрос Чырвонай Арміі, абортніца, мастак. Разам з імі біблейскі прадажнік Іуда Іскарыёт.

— Каб супакоіць настрой, я замаляваў правы край фрэскі, — кажа Пушкін. — Месца дзе стаяць супярэчлівыя постаці.

У парафіі адчулі палёгку, аднак на коратка. Праз некалькі сутак фрэска сама аднавілася.

У Бобры перажылі шок.

— Цуд! — абвясцілі ў прыходзе, — Няйначай, цуд!..

Месца, якое Аляксандр Пушкін замаляваў чорнай тушшу, цяпер яшчэ больш змрочнае. Зараз яго не дазваляюць кранаць. Цуд ёсць цуд, і ў Бобры ён вышэй усіх і ўсяго.

Ганна Кандрацюк



Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

З беларускімі песнямі

Хор студыі традыцыйнага фальклору „Ільінская пятніца” з Рыгі атрымаў на Міжнародным фестывалі „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі” спецыяльную ўзнагароду. Большасць яго рэпертуару складалі беларускія духоўныя песні, запісаныя ад беларускага насельніцтва Латгаліі ў Латвіі, беларусаў Віцебшчыны і Пскоўскага раёна. Маладыя харысты заспявалі духоўныя песні на прыгожай дыялектнай беларускай мове.

— Продкі мае і маёй жонкі — беларусы. У ранейшым саставе нашага калектыву выступалі беларусы, — заяўляе дырыжор і кіраўнік хору Сяргей Алёнкін. — Мы цікавіліся беларускімі фальклорнымі песнямі, запісвалі іх па некалькі разоў на магнітафонную плёнку, а пасля дэталёва вывучалі іх дыялектныя і музыкальныя асаблівасці. Духоўныя песні складаюць толькі частку нашага народнага рэпертуару.

Хор узнік у 1990 годзе, але яго склад часта мяняецца. Прымаў ён удзел у сарака фестывалях і навуковых канферэнцыях у Латвіі, Эстоніі, Беларусі і Расіі. Пяць разоў быў лаўрэатам Усерасійскага агляду дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў. Удзельнікі хору спяваюць фальклорныя каляндарныя песні на рускай і беларускай мовах. У яго духоўным рэпертуары знаходзяцца сціхіры, псальмы і велікодныя песні.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хор студыі традыцыйнага фальклору „Ільінская пятніца” з дырыжорам Сяргеем Алёнкіным

На Першым Сусветным з'ездзе беларускай эміграцыі. Злева направа: Ул. Шыманец, В. Жук-Грышкевіч, Ул. Тамашчык, Я. Сурвіла. Парыж, лістапад, 1948 г.

Любіў Беларусь

Зноў і зноў перачытваю „Беластоцкі сшытак" Масея Сяднёва, які ўпершыню быў апублікаваны ў „Ніве", а таксама ўвайшоў у ягоную „Масееву кнігу" (Мінск, 1994) . Успаміны Сяднёва — гэта своеасаблівая маленькая энцыклапедыя творчай інтэлігенцыі Беласточчыны паваеннага часу. Праўда, хочацца адзначыць, што аўтар выклаў свае асабістыя думкі пра таго ж Хведара Ільяшэвіча, Міхася Васілька, Аляксея Грыцука, Лялю Стаўбунік... Успамінае Масей Сяднёў і пра інжынера Уладзіміра Тамашчыка. Па-рознаму ён згадвае Тамашчыка, але трэба ўлічваць, што быў гэта трывожны час, нялёгкі для творчай беларускай інтэлігенцыі. І кожны выжываў, як мог. І ўсё ж некалькі імгненняў-успамінаў пра Уладзіміра Тамашчыка з „Беластоцкага сшытка" Масея Сяднёва хочацца прыгадаць: 1. „Інжынер Тамашчык аказаўся надта красамоўным чалавекам — мова лілася ў яго няспынна, здавалася, быццам ён гаворыць не думаючы". 2. „...чытаючы «Новую дарогу», асабліва перадавіцы ў ёй, якія пісаў, як я потым даведаўся, інжынер Тамашчык, шмат чаго было мне ў ёй, у гэтай газеце, цьмяным, а то і незразумелым"... 3. „Інжынер Тамашчык сцвярджаў, што я «не службовая асоба». Але быў да мяне часамі і спагадлівым...". 4. „З боку Тамашчыка я вычуваў нават нейкую пагарду".

Такія суб'ектыўныя ўспаміны пра Уладзіміра Тамашчыка пакінуў нам Масей Сяднёў. Тым не менш, асоба Уладзіміра Тамашчыка вартая сёння сур'ёзнай увагі. Найперш, ён моцна любіў Беларусь, быў шчырым і адданым патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. І з нашай гісторыі гэтае імя выкінуць немагчыма. Ды і ў Беларусі пра яго ведаюць мала, хіба што толькі гісторыкі і святары.

Уладзімір Тамашчык нарадзіўся 15 красавіка 1900 года на Гродзеншчыне. Бацькі яго — Даніла Тамашчык і Марыя Жанеўская, былі заможнымі і руплівымі гаспадарамі. Яны ў 1903 годзе купілі маёнтак Дубляны недалёка ад Вялікай Бераставіцы, куды і пераехалі на сталае жыццё. Але радасці было мала, бо пачалася першая сусветная вайна, якая заставіла сям'ю Тамашчыкаў эвакуіравацца ў Расію. Праўда, Уладзімір паспеў яшчэ скончыць на Радзіме пачатковую школу. А ўжо ў Омску, дзе яны бежанствавалі, наведваў сярэднюю школу, якую скончыў у 1920 годзе.

У 1921 годзе сям'я Тамашчыкаў вярнулася ў родныя Дубляны. На жаль, ужо без бацькі, які памёр перад самым ад'ездам у Беларусь. Разам з братамі Уладзіміру прыйшлося шмат працаваць, каб адбудаваць зруйнаваную вайной гаспадарку.

Жывучы на Гродзеншчыне, наш суайчыннік пачаў цікавіцца беларускай прэсай, якая выходзіла ў Вільні. Чытаў яе простаму люду, расказваў пра тыя падзеі, якія адбываліся ў Польшчы. А ў 1927 годзе польскія адміністрацыйныя ўлады яго арыштавалі і пасадзілі на тры гады ў турму за, нібыта, падрыхтоўку збройнага паўстання супраць польскага рэжыму.

У 1930 годзе Уладзімір Тамашчык прыехаў у Прагу, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Паступіў вучыцца, а праз чатыры гады атрымаў дыплом інжынера-агранома. У Празе малады інжынер знаёміцца з прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі, наведвае і сябруе з прэзідэнтам Беларускай Народнай Рэспублікі Васілём Захаркам і іншымі палітыкамі і дзеячамі культуры і літаратуры.

У пачатку саракавых гадоў Уладзімір Тамашчык з Прагі вяртаецца ў родныя Дубляны. А адтуль едзе ў Беласток, дзе пачынае працаваць намеснікам рэдактара беларускай газеты „Новая дарога". На Беласточчыне Уладзімір Тамашчык прымае актыўны ўдзел у жыцці беларусаў. А падчас нямецкай акупацыі, ведаючы добра нямецкую мову, ён ратуе многіх беларусаў ад смерці. Восенню 1943 года, калі ў Мінску застрэлілі мэра сталіцы Вацлава Іваноўскага, прымаў удзел у яго пахаванні ад беларусаў Беласточчыны, нават выступіў з патрыятычнай прамоваю...

Пасля вайны Уладзімір Тамашчык апынуўся ў Мюнхене, дзе ўзначальваў Цэнтральны беларускі камітэт у Нямеччыне. А 28 лістапада 1948 года прымаў актыўны ўдзел у Першым Сусветным З'ездзе беларускай эміграцыі, які адбыўся ў Парыжы.

3 красавіка 1949 года, пасля таго, як епіскапы Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ), на чале з архірэем Бенадыктам, пакідаюць Беларускую Царкву і далучаюцца да Расійскай замежнай Царквы, Уладзімір Тамашчык вырашае свой далейшы лёс і жыццё звязаць з БАПЦ. Спачатку епіскап Сяргей пастрыгае яго ў манаха, пасля рукапалагае манаха Васіля ў ерадыякана, пасля — у ераманаха, і ў верасні 1949 года — у сан ігумена. Прадстаўнікі беларускіх арганізацый звяртаюцца да Свяшчэннага Сінода і Сабора епіскапаў Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы з просьбай хіратанізаваць архімандрыта Васіля ў сан епіскапа. УАПЦ дае згоду. А 19 снежня 1949 года адбылася хіратонія архімандрыта Васіля ў епіскапа.

У сярэдзіне мая 1951 года епіскап Васіль (Уладзімір Тамашчык) прызначаецца адміністратарам БАПЦ у ЗША, Канадзе і ў Еўропе наогул. Ён пераязджае ў Нью-Йорк і грунтоўна займаецца царкоўна-грамадскай дзейнасцю.

Уладыка Васіль шмат зрабіў для адраджэння беларускай справы на эміграцыі. Дзякуючы яму ў Канадзе і ЗША адкрываліся новыя прыходы БАПЦ, працавалі беларускія школкі, цэнтры беларускай культуры, дзе збіраліся беларусы. Ён быў старшынёю Беларускага інстытута навукі і мастацтва, меў шмат сяброў ва ўсіх кутках свету, сябраваў і быў добра знаёмы з двума прэзідэнтамі ЗША — Лінданам Джонсанам і Рычардам Ніксанам...

Пражыў Уладзімір Тамашчык 70 гадоў. Яго не стала ў чэрвені 1970 года. Свой апошні прытулак ён знайшоў на беларускіх могілках у Іст-Брансвіку штата Нью- Джэрзі. Праводзіць Уладыку Васіля прыйшлі і прыехалі з усёй Амерыкі і Канады тысячы беларусаў. Над яго магілай з развітальнымі словамі выступілі В. Жук-Грышкевіч, Я. Сажыч, А. Грыцук, М. Тулейка, прадстаўнікі БАПЦ. Усе выступаючыя шчыра гаварылі, што ўладыка Васіль вельмі любіў Беларусь, быў вельмі ідэйным і самаахвярным для нацыянальнай справы чалавекам, выдатным дзеячам беларускага нацыянальна-вызвольнага руху.

Сяргей Чыгрын

Добра мець шчасце

Я многія гады вадзіў знаёмства з беларускім нацыянальным і палітычным дзеячам Піліпам Кізевічам, які пражываў у сваім доме па вуліцы Ветраковай 19 у Беластоку. Мы вечарамі гутарылі пра былыя часы, гістарычныя падзеі. Адзін яго расказ аб тым, як ён паўплываў на перасяленне беларусаў з Беласточчыны ў БССР, быў ужо змешчаны ў „Ніве". Вось другі расказ пра нямецкую акупацыю.

— Вучыўся я яшчэ пры цары-бацюшцы і стаў працаваць пры яго панаванні настаўнікам у сельскай школе. Пры санацыйнай Польшчы мне было недаступна працаваць настаўнікам, многія гады я быў беспрацоўным, а і спрабаваў турмаў за сваю нацыянальную і палітычную дзейнасць. Калі ў верасні 1939 г. прыйшла Чырвоная Армія, я зноў атрымаў пасаду настаўніка. Але 22 чэрвеня 1941 г. на СССР напала Германія, і ўжо 27 чэрвеня нямецкая армія заняла Беласток. Немцы не мелі дастатковай колькасці людзей для адміністравання захопленымі землямі, таму загадалі польскім чыноўнікам з'явіцца на працу. Пры іх дапамозе немцы спадзяваліся ўладаць заваяванымі тэрыторыямі і іх эксплуатаваць. Такім чынам паявіліся, не заўсёды дабравольна, польскія калабаранты. Нямецкае распараджэнне не тычылася беларусаў, бо яны чыноўнікамі пры Польшчы не былі. Як малапісьменныя, пры немцах маглі быць толькі солтысамі, сторажамі, альбо, сама больш, радавымі паліцыянтамі.

— Зразу пасля ўзнікнення польска-нямецкай адміністрацыі, — расказваў П. Кізевіч, — я пайшоў у нямецкае аддзяленне асветы, якое знаходзілася ў тым самым будынку, што былое савецкае аблана, каб знайсці там сваю персанальную папку, у якой знаходзілася мая анкета і аўтабіяграфія, якую я напісаў савецкім уладам, пачынаючы працу настаўніка. У нямецкім аддзеле асветы сядзеў загадчык — былы польскі кіраўнік. Я растлумачыў яму, што дакументы ў папцы могуць мне пашкодзіць. Я думаў, што гэты свежы калабарант будзе мне зычлівы. Загадчык пашнырыў у шафе, знайшоў маю папку, прагледзеў яе змест, але аддаць яе мне ён адмовіўся. Я вярнуўся дамоў, а цераз некалькі дзён арыштавала мяне гестапа. Дапытваць мяне стаў обер-лейтэнант. На стале ляжала мая персанальная папка. Перакладчыкамі ў гестапа былі два сыны рускага эмігранта, мабілізаваныя ў армію ў якасці перакладчыкаў. Мяне обер-лейтэнант моцна збіваў, а і на перакладчыкаў нязычліва пакрыкваў. У час допыту обер-лейтэнанта выклікалі да шэфа. Ён кінуў перакладчыкам папку, каб тыя пераклалі маю біяграфію на нямецкую мову. На шчасце, біяграфію напісаў я на беларускай мове. Выхаваныя ў Германіі перакладчыкі не разумелі ўсяго і я стаў ім перакладаць незразумелыя словы і звароты на рускую мову, змякчаючы прыкрыя для мяне моманты. На другі дзень гестапавец зноў пачаў допыты, для парадку ўдарыў мяне некалькі разоў, але менш лаяўся. Калі ён выйшаў з пакоя, і я астаўся з перакладчыкамі, раптам увайшоў нямецкі салдат і глянуўшы на мяне, спытаў па-польску:

— Panie Kiziewicz, co pan tutaj porabia?

— Jak Pan widzi, zostałem aresztowany. A skąd Pan mnie zna?, — запытаўся я салдата.

— Ja jestem polskim Niemcem i do wojny mieszkałem w Białymstoku przy ulicy Kilińskiego, ale w końcu 1939 roku, gdy na podstawie niemiecko-radzieckiego porozumienia została przeprowadzona repatriacja Niemców z terenów byłej Polski, które odchodziły do ZSRR, ja wyjechałem do Niemiec. Teraz mnie zmobilizowano do wojska i mam być tłumaczem języka rosyjskiego.

Салдат сеў, задумаўся:

— Kogo Pan zna w Białymstoku z miejscowych Niemców, którzy mogliby dać o Panu dobrą opinię?

Я назваў двое вядомых мне выкладчыкаў нямецкай мовы. Салдат узяў у іх вельмі добрыя характарыстыкі на маю асобу. На наступны дзень вывелі мяне з камеры да обер-лейтэнанта, які на гэты раз не толькі мяне не збіў, але нават не лаяўся, а толькі сказаў мне, што я свабодны, і аддаў мне папку з біяграфіяй і персанальнай анкетай.

Я зразу пайшоў да загадчыка аддзела асветы. Калі я адчыніў дзверы, загадчык глянуў на мяне, збітага, але жывога, і на яго твары адлюстраваўся страшны перапалох. Пабачыць мяне жывым ён не спадзяваўся.

— Panie kierowniku! Ja bardzo panu dziękuję za to, że pan nie oddał mi moich dokumentów personalnych, a wysłał je do gestapo — z pewnym wnioskiem. Jestem panu za to bardzo, bardzo wdzięczny. Niech pan zobaczy: o, moje dokumenty, oddało je mi gestapo. Dziękuję panu i kłaniam się. Jestem panu bardzo wdzięczny!

І зрабіў я некалькі нізкіх, фальшывых паклонаў. Нягоднік стаяў перапалоханы. На наступны дзень ён не з'явіўся на работу і знік з Беластока. Відаць, баяўся, што яго можа згладзіць савецкае падполле, якое існавала ў Беластоку.

Гісторыя досыць цікавая. Трэба было мець многа шчасця, каб пазбегчы немінучай смерці.

Мікалай Капчук

Фільмавы вечар

Цёплыя чэрвеньскія вечары спрыяюць рамантычным шпацырам, мілым завяршэннем якіх можа стаць візіт у кінатэатры. У гэтым тыдні прапаную закаханым (і не толькі ім) чатыры фільмы.

„Выратуйце Грэйс" — англійская камедыя ў рэжысуры Найджэла Коўла з Брэндай Блетын і Крэйгам Фергусанам у галоўных ролях. 50-гадовая Грэйс перажывае свае найгоршыя дні. Неспадзявана самагубствам кончыць жыццё яе муж, які акрамя добрага ўспаміну пакінуў пасля сябе і агромныя даўгі. Даходзіць да таго, што даўжнікі забіраюць маёмасць. Астаецца толькі вялікі пусты дом і цяпліца, у якой Грэйс вырошчвала кветкі. Здаецца, няма выхаду з такой цяжкай сітуацыі. Аднак жанчына прыпамінае сабе, што калісьці памагала свайму агародніку выгадаваць забароненую законам расліну — марыхуану. І так, законапаслухмяная, нясмелая, спакойная жанчына становіцца бабай-героем! Грэйс ступае на нелегальную дарогу, з якой няма ўжо выхаду...

„Агент Джоні Інгліш", рэжысёрам якога з'яўляецца Пітэр Хаўіт, гэта пародыя на шпіёнскія прыгоды славутага агента 007. Процістаўны яму Джоні Інгліш — агент 001, у ролі якога пабачым Роўэна Аткінсана, мае абараніць Англію ад таталітарнага дэспата, які пагражае знішчэннем краіны (у гэтай ролі — Джон Мальковіч). Аднак не ўсё ідзе як павінна... Не памагае экстрамашына, мільёны тэхнічных прыстасаванняў — у тым ліку шарыкавая ручка, якая страляе затрутымі стрэламі, а ўсё таму, што Джоні — невязучы. А, вядома, калі ў містэра Біна (вядомы нам Ясь Фасоля, бо з гэтай ролі найлепш памятаем Роўэна Аткінсана) праблемы — гледачы маюць пацеху...

„Іспанка" — таксама камедыя, аднак адрозніваецца ад папярэдніх тым, што прапагандуе жыццё ў Еўрасаюзе. У адной кватэры ў Барселоне спатыкаюцца сямёра маладых студэнтаў: англічанка, іспанка, бельгійка, француз, датчанін, італьянец і немец. Сярод іх вылучаецца Ксав'ер, студэнт эканоміі, які марыць стаць слаўным пісьменнікам. Сямейныя праблемы: бацька — бюракрат, маці — хіпі ды адсутнасць нармальнасці прычыняюцца да таго, што Ксав'ер шукае дарогі да шчасця, а як будзе яна выглядаць — вам трэба ўбачыць самім. Скажу яшчэ, што паяўляецца і любоўная інтрыга, а ўсё гэта на фоне сутыку розных культур, веравызнанняў, на якім смех і здзіўленне пераплятаюцца даволі часта.

На канец прапанова для аматараў хіп-хопу. Дакументальны фільм „Scratch" Дага Прэя гэта гісторыя музыкі хіп-хоп, якая здабывае ўсё новую публіку. Маладыя прыхільнікі хіп-хопу выбіраюць новы стыль жыцця і даходзяць у сваёй працы, бо выступаюць яны ў маладзёжных клубах, да перфекцыйнасці. На экране пабачым такіх ды-джэяў як Grand Mixer, DTX, Yoga Frog, DJ Krash і DJ Shadow.

Паўліна Шафран

Лепшаюць дарогі ў павеце

У выніку адміністрацыйнага перападзелу дзяржавы з 1 студзеня 1999 года большасць дагэтуль ваяводскіх дарог стала павятовымі; у Бельскім павеце такіх дарог 661 кіламетр. Гэта дарогі, якія звязваюць цэнтр павета з гміннымі мясцовасцямі і апошнія між сабою. На жаль, 90% гэтых дарог знаходзіцца ў вельмі дрэнным тэхнічным стане, а іх утрыманне і мадэрнізацыя патрабуюць вялікіх фінансавых затрат. Як паказвае вопыт, Бельскае староства можа ў працягу года пабудаваць каля 10 кіламетраў дарог. Таму важнай справай з'яўляюцца прынятыя для выканання ў 2003 годзе інвестыцыйныя дарожныя задачы.

Найбольшай такой інвестыцыяй будзе мадэрнізацыя павятовай дарогі на адрэзку Пухалы-Старэ — Планова ў Браньскай гміне. У гэтым годзе пагдыне яна звыш 820 тысяч злотаў, з чаго 396 тысяч уласных сродкаў павета, а 327 397 злотаў гарантуе датацыя з фонду SAPARD. Чарговай інвестыцыяй, таксама ў Браньскай гміне, будзе мадэрнізацыя павятовай дарогі Прушанка-Стара — Даманова; яе кошт 806 509 злотаў, з чаго 401 509 злотаў будзе з фонду PAOW.

З уласных бюджэтных сродкаў будуць рэалізаваны наступныя задачы:

— мадэрнізацыя павятовай дарогі на адрэзку Верцень — Гаўрылкі ў Боцькаўскай гміне: 350 тысяч злотаў;

— мадэрнізацыя вуліцы ў вёсцы Коцэ-Баровэ ў Рудчанскай гміне: 170 тыс. зл.;

— мадэрнізацыя павятовай дарогі на адрэзку Спічкі — Орля ў Арлянскай гміне: 20 тыс. зл.;

— мадэрнізацыя дарогі ў Пасынках у Бельскай гміне: 180 тыс. зл. (разам з дакументацыяй);

— мадэрнізацыя ў Бельску-Падляшскім вуліцы Міцкевіча ад вуліцы Відаўскай да вуліцы Клеберга разам са стаянкай і пешапраходам: 80 тыс. зл.;

— выкананне дакументацыі для перабудовы вуліцы Яна Паўла II у Браньску: 8 тыс. зл.

Вызначэннем аб'ёму работ на павятовых дарогах займаецца Павятовая ўправа, якая свае задачы выконвае з дапамогай Павятовай дарожнай управы.

Міхал Мінцэвіч

Каго вінаваціць?

За Кузавай, непадалёк могільніка, знаходзіцца звалка. Раней у гэтым месцы была жвіроўня. Сумежны сасняк забруджаны ўсялякімі адходамі: фольгавай упакоўкай, пластмасавымі бутэлькамі ды паперай. Месца неабгароджанае. Ніхто за сметнікам не наглядае. Адзін вецер-свавольнік гуляе на прасторы. Жыхары вёскі прапанавалі паставіць агароджу, але ідэя памерла. Войт аргументаваў, што сетку на другі дзень украдуць. Больш чвэрці стагоддзя служыла жвіроўня кузаўцам. Хто арганізаваў звалку ў кар'еры — цяжка сказаць. Войт тлумачыць, што гмінная звалка знаходзіцца адно ў Чаромсе (патрабуюцца для гэтай справы адпаведныя ўмовы). У Кузаве напэўна другой няма, хоць можна палічыць гэтае месца масавай звалкай.

— Кожная вёска мае жвіроўню, — тлумачыў Міхась Бішчук. — У час камасацыі геадэзісты вызначылі такую плошчу і для нашай вёскі. Зараз няма дзе здабываць гравій, бо ямы завальваюць бесталкова. Кузаўцы наглядаюць за парадкам, але прыезджыя патрапяць скінуць смецце на дарозе. Гміна пасылала экскаватар для зраўнання, але зараз на кузаўскай звалцы адно садом ды гамора. Каго вінаваціць за гэта? Перад Вялікаднем вывозіў я лом на звалку. Чаго тут няма? Новенькія чыгуначныя уніформы (даўнейшай моды), фуры саломы, аўтамабільныя дэталі ды многа іншых рэчаў прыдатных у гаспадарцы. Некаторыя пенсіянеры з Чаромхі-Станцыі прыязджаюць сюды і выбіраюць лепшыя рэчы. Калі я ў гміне кранаў справу звалкі, дык войт абяцаў падаслаць кіраўніка камунальнай гаспадаркі для праверкі, а калі спатрэбіцца — падаслаць людзей для добраўпарадкавання навакольнай тэрыторыі. Мабыць праблема будзе вырашана.

Уладзімір Сідарук

Заклік

Хочам дапамагчы дзецям

Наша арганізацыя — гэта прафсаюз, які гуртуе малых і сярэдніх прадпрымальнікаў Беларусі. Мы дапамагаем прадпрымальнікам, работнікам, а таксама звычайным людзям. Мы арганізацыя непрыбытковая і не можам займацца якой-небудзь гаспадарчай дзейнасцю. Аднак з прычыны складанага становішча ў Беларусі, па сіле магчымасцей, стараемся дапамагаць найбольш патрабуючым, асабліва дзецям. І менавіта таму вырашылі мы звярнуцца да людзей добрай волі за дапамогай.

Нам хацелася б сарганізаваць дзецям з дзетдамоў і маламаёмных сем'яў летні адпачынак. Мог бы гэта быць летнік або пабыўка дзяцей у сем'ях у Польшчы. Са свайго боку мы можам забяспечыць транспарт, на якім можна было б прывезці дзяцей у Польшчу. Ва ўсім астатнім разлічваем на дапамогу дабрачынцаў. З вялікай удзячнасцю прымем таксама рэчавыя падарункі, асабліва харчы, ласункі, цацкі, школьныя артыкулы, вопратку, дзіцячы абутак.

Будзем удзячны за любую дапамогу нашым дзецям. А яны самі аддзячаць дабрачынцам сваёй радасцю і ўсмешкай.

Рэспубліканскі Савет прафсаюза работнікаў кааператываў, малых прадпрыемстваў і другіх форм прадпрымальніцтва „Садружнасць"

Праспект Машэрава, 21, 220126 г. Мінск, тэл. (017) 223-80-63, 223-82-03, 223-97-42

Чыжоўская гміна

Водаправод, дарога і адміністрацыйны будынак

Сёлета ў Чыжоўскай гміне (Гайнаўскі павет) пабудуюць водаправод на прысёлках Койлаў і Курашава за звыш 338 тысяч злотых, перабудуюць дарогу з Лушчоў у Курашава за кошт 134 тыс. зл., а таксама будуць працягваць пабудову адміністрацыйнага будынка Гміннай управы ў Чыжах — каштаваць будзе гэта бюджэт гміны 60 тыс. зл.

Варта дадаць, што ў гэтым годзе добраахвотная пажарная каманда ў Кленіках атрымае ў карыстанне радыёстанцыю.

(яц)

Цікаючая кантрабанда

Што і руш Падляшская часць Памежнай службы перасылае інфармацыі аб спыненні чужаземцаў або затрыманых на базарах за гандаль без неабходнага дазволу, а прытым нязгодна з мэтай дэкларавання пры ўездзе ў Польшчу. Галоўным чынам гэта беларусы і літоўцы. Інфармацыі пра гэта наплываюць масава, амаль штодзень. Так, вось, перастаюць быць журналісцкім атракцыёнам.

У апошні час паявілася цікавінка. Памежнікі затрымалі беларуса, які хацеў увезці... 1 265 наручных гадзіннікаў. Да кантрабанды мела дайсці на пагранпераходзе ў Баброўніках. Гадзіннікі былі знойдзены ў люку пад падлогай аўтобуса. Як акрэсліла прэс-інфарматарка падляшскіх пагранічнікаў Анна Валошын-Врона, цікаючая кантрабанда вартая 8,2 тыс. злотых. Пасля састаўлення адпаведнай дакументацыі, грамадзянін Беларусі быў перададзены мытным службам.

Спробу кантрабанды гадзіннікаў у масавым маштабе ў апошні час зафіксавалі летась у снежні ў Агародніках. Тады намерваўся нелегальна перавезці іх аж 350 штук грамадзянін Літвы.

(мах)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Двух мільярдэраў у гатэлі:

— Не давяраю гэтым сейфам у гасцініцы і заўсёды трымаю грошы з сабою, аднак калі сплю, баюся, што мяне абкрадуць.

— Трэба рабіць так, як я: трымаць кашалёк пад падушкай.

— Што вы! Я б ніколі не заснуў, калі б падушку меў так высока.

* * *

— Спадар дырэктар, ваша жонка ўцякла з вашым шафёрам!

— Нічога не сталася; і так меў я яго звольніць, бо занадта бегаў за бабамі.

* * *

У Маскве ў сотую гадавіну смерці Пушкіна аб’явілі конкурс на помнік з гэтай нагоды. Першую прэмію атрымаў праект „Пушкін чытае вершы Сталіна”, другую — „Сталін чытае вершы Пушкіна”. Перамог праект „Сталін чытае вершы Сталіна”.

* * *

У Савецкім Саюзе ўпершыню выпусцілі Біблію. Кніга пачыналася са слоў: „Сначала не было ничего, только товарищ Бог гулял по улицам Москвы”.

* * *

У XX стагоддзі многія мужчыны жаніліся са старэйшымі за сябе жанчынамі. У ЗША — бо ў старэйшых жанчын больш долараў, у Францыі — бо старэйшыя больш спрактыкаваныя, у СССР — бо жаніхі мелі надзею, што іх жанчыны асабіста ведалі Уладзіміра Ільіча Леніна.

* * *

У касцельнай лаўцы побач пажылой жанчыны сядзіць малы хлопчык. Набліжаецца касцельны з тацай. Бабулька пачынае нервова мяць сумачку. Хлопчык шэпча ёй:

— Вазьміце маю дзесятку і ўкіньце, а я схаваюся пад лаўку.

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31	32

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. не мела клопату, дык купіла парася
= 3 __ 2 __ 25 __ 24 __;

2. алкагольны напітак з ягад або садавіны
= 5 __ 32 __ 7 __ 30 __;

3. пярэдняя частка тулава ад шыі да жывата або малочныя залозы ў жанчыны
= 31 __ 29 __ 20 __ 27 __ 26 __ 9 __;

4. тонкі плоскі кусок бляхі або паперы
= 23 __ 22 __ 18 __ 19 __;

5. печаны выраб з тонка раскачанага цеста з начынкай
= 21 __ 13 __ 10 __ 11 __ 12 __;

6. невялікая зімовая павозка на двух палазах для катання з горкі
= 16 __ 28 __ 8 __ 1 __ 6 __;

7. скошаная і высушаная трава на корм жывёле
= 4 __ 15 __ 14 __ 17 __; (Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 15 нумара

Вада, кроў, Рыга, невад, прашча, дына, выпас, радок, руіна, Брайль, бард.

Рашэнне: **Дарога да праўды вымашчана парадоксамі. Уайльд.**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Юрасю Сцяпанаву** з Віцебска.

Жарты з уладай

Пайшлі мы з сябрамі на еўрасаюзны пікнік у цэнтры Беластока. Там сама, дзе нядаўна высвістаў Цёмнаград усеагульнага нашага польскага прэзідэнта. Бурныя апладысменты вітаюць яго ў Еўропе на ўладных форумах, а ў нашым горадзе — як не градабой (добра, што не тухлымі яйкамі), то свісты на пасвісцёлах. Кожны можа выказацца як умее ды як хоча. І нельга забараняць. Патлумачыць трэба, наставіць на добрую дарогу. Палітычна ды дыпламатычна. Еўропа. Калісь аднаго такога паліцыянт, не стрываўшы, крыху пакамечыў, папраўдзе, ва ўласнай абароне, бо раз’яраны праціўнік усяго левага ды цэнтральнага лез сляпіцаю, вішчаў свае лозунгі, шарпаўся і пёр проста на прадстаўніка ўлады з такой нянавісцю на перакошаным абліччы, дык рашучыя ды паспяховыя паводзіны ахоўніка парадку, які сціснуў яго ў жалезных абдымках, давялі да нейкага спакою. А цяпер таго паліцыянта цягаюць па судах. Бо той драпежнік — уладны. У апазіцыі да чагось там. І, кажа, не за некультурныя паводзіны яго пакаралі, а за погляды. А погляды — рэч святая...

— Ну, сёння, пэўна, будзе парадак, — заўважыў Коля. — Ніякага мардабою паміж еўраскептыкамі і еўраэнтузіястамі...

— Шкада... — уздыхнуў Збышка. — І салідных вяселляў нямашака цяпер, каб кроў лілася, ні дэманстрацый...

— Паехаў бы ты на блакаду „Самаабароны”, *хлопе*, то і цябе патузалі б, — звярнуў я ўвагу бадзёра настроенаму Збышку.

— Калі хто хоча, каб адрэналін у венах закіпеў, хай едзе, ідзе, змагаецца, — МакХолад заняўся кашанкай, купленай у адной з будак, якія зараблялі вялікія грошы на стынучых тлустых каўбасках, кашанках і чымсьці падобным да шашлыкоў. — Ну, хіба ж гэтага не даем. А заплаціў аж сем пяцьдзесят. А мела быць „Сусветная кухня”, пісалі ў газетах.

— Не вер у пісанае! — паляпаў я нашага маладога сябра па худым плечуку. — Якраз ты!

Пахадзілі мы туды-сюды, падзівіліся на маладых і старых, нейкіх фінаў што прыехалі ў Беласток паказаць свой Еўрасаюз. Паслухалі спеваў дзетак і моладзі. Дзьмухаў ветрык і сляпіла сонца, хоць даймаў холад. Як то кажуць у народзе, „вясновыя халодныя агароднікі”... Ды колькі можна хадзіць, есці, піці, глядзець... Сталі мы збірацца дахаты.

— Давайце, хлопцы, станьце да здымка, — запрапанавала нам раптам ніўская карэспандэнтка. — Хай народ убачыць, як выглядаюць Вандал і яго сябры.

— Ты ўжо нам рабіла здымак, летась вясною, — заўважыў Збышка. — На скверыку за ратушай.

— Добра, што яго нікому не паказвала! — уцешыўся Коля. — Я на ім такі стары бачыўся.

— Гляньце, анёл-ахоўнік! — паказаў я пальцам на паліцыянта, за якім на хадулях уздымаўся сапраўды, як анёл, акцёр у белым адзенні, з зорным цёмнасінім сцягам Еўрасаюза на грудзях, а ягоныя белыя крылы тармасіў вецер. І сталі так перад намі — ахоўнік правапарадку, а за ім той еўрасаюзны анёл.

— Проша панства, вось — анёл-ахоўнік! — азарыла мяне.

— Я дам вам тут анёла ахоўніка! — узлаваўся паліцыянт.

— Ой, Ванька, пакараюць цябе за знявагу ўлады! — злякаўся Коля. — Ты заўсёды кудысьці ўлезеш, штось ляпнеш.

— Панове з Фінляндыі! — паспяшыла нам з дапамогай ніўская карэспандэнтка.

Вандал Арлянскі

XXIV Дні Бельска-Падляшскага

30.05 — 1.06.2003 г.

Праграма святкаванняў
(выбраныя мерапрыемствы)

Пятніца – 30 мая 2003 г.

гадз. 10-12, Гарадскі амфітэатр: блок мерапрыемстваў „Бельскія дні сям’і”, а ў ім канцэрт дзіцячых калектываў, казка „НЛА з зялёнай планеты” і вырашэнне пластычнага конкурсу „Самыя прыгожыя месцы майго горада”.

гадз. 10-12, Пасёлкавы дом культуры: турнір ведаў аб горадзе для вучняў гімназій і сярэдніх школ.

гадз. 12, Гарадская публічная бібліятэка: навуковая сесія „Еўрасаюз і шанцы развіцця Бельска-Падляшскага”.

гадз. 16, Бельскі дом культуры: адкрыццё выставы сучаснага жывапісу Багдана Маршанюка.

гадз. 16, Гарадскі амфітэатр: блок мерапрыемстваў з нагоды Дня дзіцяці, у тым ліку канцэрт мясцовага калектыву „Віялінкі” і калектыву „Душкі з пушкі” з Нараўкі.

гадз. 17, Музей у Ратушы: „Бельск-Падляшскі – горад пагранічча” – прэзентацыя фотальбома з нагоды 750-годдзя пісьмовай згадкі аб горадзе.

Субота – 31 мая 2003 г.

гадз. 12-15: Пачатковая школа № 3: Міжнародны турнір бальных танцаў.

Гарадскі амфітэатр:

гадз. 12-15: дзіцячы фэст са шматлікімі конкурсамі і гульнямі.

гадз. 16-18: фінал еўрапейскага школьнага турніру з прэзентацыяй танцаў розных народаў.

гадз. 18: праграма для дзяцей „Кульфон і жаба Моніка”.

гадз. 19^{30}: канцэрт грэчаскага калектыву „Мытос”.

Нядзеля – 1 чэрвеня 2003 г.

Ад гадз. 12^{30} – пад поўнач, Гарадскі амфітэатр – Летняя студыя Радыё Беласток, у тым ліку:

гадз. 13^{05}-17^{30}: канцэрты духавых аркестраў.

гадз. 17^{30} і 19^{00}: Тыскі кабарэ.

гадз. 18^{00}: спектакль тэатра „Белы клоун”.

гадз. 20^{00}: канцэрт гурту „After Hour”.

гадз. 21^{00}: канцэрт гурту „Big Cyc”.

Святкаванню Дзён Бельска-Падляшскага спадарожнічаюць выставы выданняў пра Еўрапейскі Саюз у Гарадской бібліятэцы і „Мяшчанскія пісанкі” ў Музеі малой айчыны ў Студзіводах ды шмат атракцыёнаў, напрыклад, палёт на аэрастаце, паказы пажарнай і паліцэйскай тэхнікі, дрэсіравання службовых сабак, футбольныя і тэнісныя матчы, латарэі.

ISSN 0546-1960